

ЗНАК І СІМВАЛ МУЖНАСЦІ 8

СВЯТЛО ТАКОЙ БЛІЗКАЙ «ЗВЯЗДЫ» 12




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 ЛІСТАПАДА 2021 г. СЕРАДА № 217 (29586)


КОРАТКА

• Чырвоны Крыж і члены Савета Рэспублікі перадалі гуманітарную дапамогу на беларуска-польскую граніцу.

• **Раман Кагадоўскі стаў ліцэістам МУС.**

• Прадпрыемствы з 50 працэнтамі інвалідаў у калектыве могуць вызваліць ад выплаты падатку на зямлю.

• **Для рэалізацыі саюзных праграм Беларусі і Расіі неабходна прыняць каля 400 дакументаў.**

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Мы ўсведамляем, ведаем сваё месца, але на калені не станем»

## Прэзідэнт даў інтэрв'ю галоўнаму рэдактару расійскага часопіса «Национальная оборона», ваеннаму эксперту Ігару Каротчанку

**Ігар Каротчанка ўжо не новы чалавек для беларускага экспертнага асяроддзя. Ён быў удзельнікам «Вялікай размовы» з Прэзідэнтам сёлета ў жніўні, зараз у якасці эксперта актыўна каментуе падзеі для айчыннага тэлебачання. Інтэрв'ю працягнулася амаль дзве з паловай гадзіны. Былі закрануты разнастайныя тэмы актуальнага парадку. Падчас інтэрв'ю Аляксандр Лукашэнка расказаў пра партнёрскія адносіны з Расіяй, выказаў свае меркаванне аб еўрапейскіх лідарах і палітыцы Злучаных Штатаў Амерыкі, украінскім крызісе, падзяліўся падрабязнасцямі канстытуцыйнай рэформы. Закранался ў размове і адно з асабліва актуальных на сёння пытанняў — мігранцкі крызіс на граніцы Беларусі з краінамі Еўрасаюза.**

Прэзідэнт адзначыў: на граніцы польскія вайскоўцы размясцілі танкі, узброеных вайскоўцаў не для таго, каб супрацьстаяць міграцыйнаму крызісу.

«Змагацца сёння супраць мігрантаў «Леапардамі»? Выбачайце... Мы з вамі людзі ваенныя. Мы разумеем, што такое весці вайну з гэтымі няшчаснымі людзьмі на граніцы Польшчы з Беларуссю і накіроўваць калоны танкаў. Зразумела, што гэта трэніроўка ці шантаж», — заўважыў кіраўнік краіны.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Беларусь спакойна супрацьстаіць гэтаму. Ведаем: пры допушчэнні памылкі ў падзеі будзе ўцягнута Расія — наймагутнейшая ядзерная дзяржава. «Я не вар'ят. ***Я выдатна разумею, да чаго гэта можа прывесці***. Таму няма тут ніякага геразіму — схапіў аўтамат і пайшоў на польскую граніцу, дзе я служыў пагранічнікам. Не, ні ў якім выпадку. ***Мы ўсведамляем, ведаем сваё месца, але на калені не станем***», — падкрэслівае Аляксандр Лукашэнка.



Фота БелТА.

Прэзідэнт, адказваючы на пытанне, звярнуўся да вытокаў мігранцкага крызісу. Ён назваў Хафеза Асада, Садама Хусейна, Муамара Кадафі лідарамі і мысліўцамі, якія выдатна разумелі ход падзей. «Гэтыя мярзотнікі іх забілі і Башара Асада таксама хочуць знішчыць, — сказаў Прэзідэнт. — Яны знеслі лідараў, а потым пайшлі ў краіны. Ім неабходна было перабудаваць Блізкі і Сярэдні Усход».

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ



**Іван КРУПКО, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«Мы атрымаем сёлета збожжавых каласавых, кукурузы і рапсу ў цэлым больш як 9 млн тон. Ужо забяспечаны дзяржзаказ на ўзроўні 1 млн тон. Гэта значыць, харчовым збожжам краіна забяспечана пад поўную патрэбу. Жывёлагадоўля таксама будзе цалкам забяспечана травяністымі кармамі і фуражным збожжам для выканання задач, якія стаяць на 2022 год на росце вытворчасці малака, ялавічыны, свініны, мяса птушкі. Калі гаварыць аб экспарце беларускіх прадуктаў харчавання, то стаіць задача да 2025 года выйсці на лічбу $7 млрд. У гэтым годзе доля расійскага рынку — больш як 70 працэнтаў. Ён застаецца больш прэміяльным як рынак стратэгічнага партнёра, але яго ўдзельная вага ў нашых пастаўках паступова змяншаецца. Ідзе дыверсіфікацыя экспарту харчавання. Растуць пастаўкі ў краіны СНД, ЕС, Афрыкі, а таксама ў Кітай, мы назіраем узды́м па ўсіх рынках».*

Дэпутацкая акруга

# ШТО СТАІЦЬ ЗА КОЛЕРАМ МАРСАЛА

## Як выхаванцы гродзенскага дзіцячага дома вучыліся змешваць фарбы і спасцігаць таямніцы папулярных прафесій

**Такую магчымасць для дзяцей і падлеткаў упершыню арганізавалі адразу некалькі ўстаноў і арганізацый. Завадатарам сустрэчы стала дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Ірына ЛУКАНСКАЯ. Выхаванцы дзіцячага дома пазнаёміліся таксама з прадстаўнікамі Гродзенскай гарадской арганізацыі «Гродненчанка», якія набылі для дзяцей полівітамінныя комплексы. Ад РУП «Фармацыя» паступілі антысептыкі і сродкі індывідуальнай аховы.**

Добры кантакт адбыўся з выкладчыкамі і навучэнцамі Гродзенскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа бытавога абслугоўвання, а таксама з лаўрэатамі міжнародных конкурсаў цырульніцкага майстэрства, якія арганізавалі для дзяцей майстар-клас.

Такая сустрэча зладжана дзеля таго, каб пазнаёміць падлеткаў з цікавымі прафесіямі, дапамагчы ім вызначыцца з далейшым выбарам у жыцці.

СТАР. 8

Эксклюзіў

**Се СЯАЮН:**

# МІЖРЭГІЯНАЛЬНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА СТАЛА НОВЫМ ПУНКТАМ РОСТУ Ў АДНОСІНАХ БЕЛАРУСІ І КІТАЯ



Фота БелТА.

**КНР займае выключнае месца ў знешняй палітыцы Беларусі, гэта наш асноўны стратэгічны партнёр у азіяцкім рэгіёне. Такім чынам акрэсліў узровень супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў намеснік міністра замежных спраў Беларусі Мікалай Барысевіч на цырымоніі адкрыцця Года рэгіёнаў Беларусі і Кітая. У межах гэтага глабальнага міждзяржаўнага праекта ў 2021—2022 гадах намечана правесці дзясяткі важных мерапрыемстваў. Чаму міжрэгіянальнае супрацоўніцтва стала новым пунктам росту ў адносінах Беларусі і Кітая, у эксклюзіўным інтэрв'ю «Звяздзе» распавёў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Се СЯАЮН.**

СТАР. 4-5

ISSN 1990 — 763X

# «Мы ўсведамляем, ведаем сваё месца, але на калені не станем»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, амерыканскія палітыкі не толькі «расштурхалі» Блізкі і Сярэдні Усход, але і знішчылі дзяржаўнасць і ўклад жыцця мясцовага насельніцтва. «Я сёння ноччу прачнуўся і падумаў: што там самае страшнае? Ведаеш, Ігар, нават не вайна. ***Там самае страшнае — адсутнасць перспектывы***. Уяві, у нас дзеці, якая ў іх будучыня? Адукацыя? Там яе нельга атрымаць. Ахова здароўя — ніякая, пра культуру і спорт і казаць няма чаго», — разважае Прэзідэнт.

Жыхароў гэтых краін, якія шукалі лепшага жыцця, нагадаў кіраўнік краіны, некалькі гадоў таму запрасілі нямецкія палітыкі. «І пайшоў транзіт. А самае небяспечнае сёння — гэты транзіт забяспечваецца людзьмі. Там людзі фарміруюць гэтыя калоны. Зараз з Афганістана пайшоў прыток. Адтуль хлынуць людзі. Іх некалькі мільёнаў там, хто служыў амерыканцам у Афганістане. Амерыканцы іх таксама паклікалі, але загадалі (забраць. — «**Зв.**») Еўропе і Цэнтральнай Азіі. Але цэнтральнаазіяцкія рэспублікі сказалі: «Прабачце». І куды яны пойдуць? Пойдуць у Еўропу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Прэзідэнта, афганцы ідуць да лепшага еўрапейскага жыцця праз цэнтральнаазіяцкія рэспублікі, Расію, Беларусь, Украіну. У Беларусь бежанцы прыбываюць законна, праз аэрапорт, які з лета заблакіраваны еўрапейскімі перавозчыкамі. «Свята месца пуста не бывае. Сюды дзясяткамі рынуліся самалёты з Блізкага, Далёкага Усходу, з разбомбленых дзяржаў. Едуць людзі — ідуць на граніцу», — сказаў кіраўнік краіны.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, лагістыка дастаўкі мігрантаў да граніцы арганізавана пэўнымі асобамі. «Гэты транзіт забяспечваюць людзі. Там у самалёт пасадзяць. Самалёт прыляціць сюды. Тут іх возьмуць, на граніцу прывязуць, праз граніцу перавядуць. І там іх прымаюць ужо свае — палякі, немцы, украінцы і іншыя. Усё за грошы. Адтуль жа едуць нябедныя людзі. А калі і бедныя, ім сабралі гэтыя грошы», — сцвярджае Прэзідэнт.

Па словах кіраўніка краіны, дзеянні «транзіцёраў» адсочваюцца. «***Дзясяткі транзіцёраў, што людзей падкідваюць, гэта немцы, перадусім палякі, і яшчэ ўкраінцы, літоўцы. Там свая мафіёзная структура, якая забяспечвае гэты транзіт***», — дадаў Аляксандр Лукашэнка, падкрэсліўшы, што бежанцы едуць у Еўропу не на пустое месца, а да сваіх родных, сяброў, якія іх там загадзя чакаюць. Беларусь з'яўляецца толькі кропкай на гэтым шляху.

Як заявіў Прэзідэнт, супраць Беларусі развязана сапраўдная гібрыдная вайна ва ўсіх сферах — СМІ, палітыцы, эканоміцы і бяспецы. «***Гібрыдная вайна! І вы, мярзотнікі, бяздумцы, хочаце, каб я вас абараняў ад мігрантаў у тым ліку? Што, я не лагічна разважаю? Вы гэта зладзілі — атрымайце***», — абурыўся кіраўнік краіны.

Ён нагадаў аб нядаўна заключаным Дагаворы з ЕС аб рэадмісіі, згодна з якім Беларусь павінна была забраць на сваю тэрыторыю людзей, якія незаконна трапілі праз нашу краіну ў Еўропу. ЕС абавязваўся пабудаваць месца знаходжання для гэтых асоб. «Увёўшы супраць нас санкцыі, яны гэта кінулі — і не фінансуюць, і не будуюць гэтыя лагеры. Я не буду гэтага рабіць. Яны выйшлі з гэтага дагавора. Парушылі яго. Я да гэтага не маю ніякіх адносін. Бягуць? Хай бягуць. Я, што, іх да сябе вярну і анклавы тут ствару? Мне і так праблем хапае», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі Прэзідэнт абурыўся, чаму еўрапейскія праваахоўнікі маўчаць аб збіцці, смерцях бежанцаў, і акцэнтаваў, што ўсе звесткі аб такіх фактах ішлі праз беларускія медыя.

«Гэта добра арганізаваны працэс (дастаўка мігрантаў на граніцу. — «**Зв.**»). Не трэба патрабаваць ад мяне, каб я, як раней, спыняў гэты працэс, менавіта спыняў, а не фінансаваў, як амерыканцы ўчора заявілі. Заявілі, быццам я фінансую гэты беглых. Мне, што, няма куды грошы дзяваць? І ўвогуле, калі я фінансую — факты на стол! А так, вялікія амерыканцы языком ляпнулі і забыліся», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт адзначае, што падобныя заявы апанентаў яго не хвалююць. Небяспечна іншае — супрацьстаянне на граніцы можа прывесці да ўзброеных канфліктаў.

«***Я баюся, каб супрацьстаянне на граніцы з-за мігрантаў не прывяло да вострай фазы, не стварыла глебу для правакацый. Я ўжо сваіх ваенных папярэдзіў, каб хлопцы глядзелі. Мы не страляем паверх галоў, як робяць яны.*** Нашы верталёты не лётаюць над імі. Калі верталёт на вышыні 20—30 метраў праляціць над імі, там здувае дзяцей, людзей. Такім чынам іх пужаюць. Вось іх твар. Яны заўсёды былі такімі», — расказвае Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### ДАВЕДКА

Часопіс «Национальная оборона» з'явіўся ў 2006 годзе. Ён арыентаваны на пэўнае кола чытачоў — ваенна-палітычнае кіраўніцтва Расіі, супрацоўнікаў сілавых органаў, дыпламатаў, кіраўнікоў прадпрыемстваў абароннага комплексу. Агульны тыраж — 22,5 тысячы экзэмпляраў. Часопіс выходзіць у друкаваным і электронным відзе, мае англамоўную версію.

### КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

«У асобе Аляксандра Лукашэнкі мы бачым выбітнага палітыка, лідара. Маштаб яго асобы раскрываецца ў асабістым інтэрв'ю. Самае галоўнае, што я зразумеў, ацэнкі Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі, як вялікага сябра і надзейнага стратэгічнага партнёра Расіі, былі правільныя. Аляксандр Рыгоравіч яшчэ раз пацвердзіў свой курс на стратэгічнае партнёрства, саюзніцкія адносіны з Расійскай Федэрацыяй, агульнасць нашых мэт і задач у сённяшнім няпростым свеце», — сказаў пасля размовы з Прэзідэнтам **Ігар КАРОТЧАНКА**.

Эксперт адзначыў, што сустрэча з Прэзідэнтам Беларусі яго ўразіла шчырасцю, нефармальнасцю. Ён упэўнены: інтэрв'ю будзе цікавым чытачу з-за эксклюзіўнасці матэрыялаў.

«Пры Прэзідэнце Лукашэнку ўзыходзілі еўрапейскія палітычныя зоркі і пры ім жа заходзілі. Ён расказаў цікавыя моманты сустрэчы з еўрапейскімі, амерыканскімі палітыкамі. Гэтыя рэчы дастаткова эксклюзіўныя. У гэтым плане палітычны вопыт беларускага лідара мае каласальнае значэнне асабліва цяпер, калі бачым ціск на Беларусь, Расію», — акцэнтаваў інтэрв'юер.

Па яго словах, размова з Прэзідэнтам будзе апублікавана ў часопісе «Национальная оборона» ў поўным аб'ёме, бо ўсе адказы надзвычайна актуальныя для чытачоў выдання.

### ПРЭЗІДЭНТЫ БЕЛАРУСІ І РАСІІ АБМЕРКАВАЛІ СІТУАЦЫЮ НА ГРАНІЦЫ

У ходзе тэлефоннай размовы, што адбылася ўчора, Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін зверылі гадзіннікі па двухбаковым парадку дня ў цэлым — самыя актуальныя інтэграцыйныя пытанні на кантролі кіраўнікоў дзяржаў, перадае прэс-служба Прэзідэнта Беларусі.

Па яе інфармацыі, асаблівае месца ў размове заняло абмеркаванне сітуацыі на беларуска-польскай граніцы, а таксама жорсткія дзеянні польскага боку ў адносінах да мірных людзей. Але найбольшую заклапочанасць у лідараў выклікае сцягванне на граніцу рэгулярных войскаў Польшчы.

---

Парламенцкі дзённік

## Адбылося пасяджэнне шостай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання

# НОВЫЯ ЗАКОНАПРАЕКТЫ І МЭТЫ НА БУДУЧЫНЮ

**Канстытуцыйны рэферэндум, беларуска-расійская інтэграцыя, актуальныя законапраекты і іншыя надзённыя пытанні грамадска-палітычнага жыцця краіны абмеркавалі на пасяджэнні шостай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання. Адкрываючы пасяджэнне, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА падкрэсліў, што прыярытэтам для дэпутатаў на найбліжэйшую перспектыву з'яўляецца падрыхтоўка да Канстытуцыйнага рэферэндуму.**

«Рабочая група, у склад якой увайшлі і парламентарыі, на мінулым тыдні прадставіла кіраўніку дзяржавы дапрацаваны праект новай Канстытуцыі. У найбліжэйшы час дакумент будзе вынесены на разгляд Канстытуцыйнай камісіі. Гэта накладае асаблівую адказнасць на дэпутатаў — членаў Канстытуцыйнай камісіі ў плане якаснай дапрацоўкі тэксту праекта», — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка. Ён падкрэсліў, што да гэтага працэсу павінны актыўна падключацца ўсе дэпутаты, паколькі ў грамадскім абмеркаванні Канстытуцыі дэпутацкаму корпусу адведзена вельмі сур'ёзная роля.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў звярнуў увагу, што пасля прыняцця абноўленай Канстытуцыі значна павялічацца аб'ёмы заканатворчай дзейнасці. «Таму за месяц з невялікім, які застаўся да завяршэння бягучай сесіі, неабходна ў поўным аб'ёме рэалізаваць усё, што было намечана на найбліжэйшы перыяд», — канстатаваў ён.

### МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Уладзімір Андрэйчанка згадаў важнае палітычнае мерапрыемства, якое адбылося 4 лістапада, — пасяджэнне Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы. На ім прэзідэнты Беларусі і Расіі падпісалі Дэкрэт, які зацвердзіў 28 саюзных праграм. Па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, падчас рэалізацыі праграм у першую чаргу неабходна ўдзяліць увагу рабоце па ўніфікацыі заканадаўстваў, забеспячэнні аднастайнай правапрымяняльнай практыкі. Старшыня Палаты Прадстаўнікоў акцэнтаваў увагу, што ў лістападзе ў Мінску адбудзецца 61-я сесія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. «Саюзным парламентарыям неабходна будзе вырашыць шэраг арганізацыйных пытанняў, якія датычацца сумеснай работы. У прыватнасці, неабходна зацвердзіць паўнамоцтвы новага саставу расійскай дэпутацыі ў Парламенцкім сходзе, а таксама сфарміраваць камісіі сходу», — сказаў спікер.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў акцэнтаваў увагу на тым, што важна аператыўна даводзіць да міжнароднай парламенцкай супольнасці аб'ектыўную інфармацыю аб сітуацыі вакол Беларусі. Асноўнай задачай для парламенцкіх груп сяброўства ён назваў садзейнічанне ў рэалізацыі перспектыўных інвестыцыйных і гандлёва-эканамічных праектаў, дыверсіфікацыі рынкаў збыту айчынных прадуктаў і тэхналогій.

Уладзімір Андрэйчанка расказаў, што перад пасяджэннем сустракаўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом В'етнама ў Беларусі Фам Хаем. На сустрэчы было пацверджана аднаўленне дзейнасці групы сяброўства з Беларуссю ў новым складзе в'етнамскага парламента. Рабочай групе Нацыянальнага сходу Беларусі па супрацоўніцтве з В'етнамам неабходна належным чынам падысці да напаўнення запланаванага сумеснага пасяджэння груп міжпарламенцкага супрацоўніцтва. На парадку дня — актуалізацыя далейшага супрацоўніцтва краін, як у двухбаковым фармаце, так і на міжнародных пляцоўках».

### ЭКАНАМІЧНЫЯ ЗОНЫ, НАВАКОЛЬНАЕ АСЯРОДДЗЕ І ДАРОЖНЫ РУХ

Падчас сесіі дэпутаты асаблівую ўвагу ўдзялілі праектам, якія запатрабаваны бізнес-супольнасцю і людзьмі. У першую чаргу Грамадзянскаму кодэксу, Кодэксу аб адукацыі і культуры, рабоце над карэкціроўкай законаў аб ліцэнзаванні, пытанням барацьбы з карупцыяй, зваротам грамадзян і юрыдычных асоб.

Дэпутаты ў першым чытанні прынялі законапраект «Аб змяненні закона Рэспублікі Беларусь «Аб свабодных эканамічных зонах». Ён падрыхтаваны ў рамках работы па пераразмеркаванні паўнамоцтваў паміж органамі дзяржаўнай улады і прадугледжвае перадачу паўнамоцтваў кіраўніка дзяржавы па змяненні граніц свабодных эканамічных зон Савета Міністраў.

Таксама дэпутаты ў першым чытанні прынялі законапраект «Аб змене законаў» (па пытанні перадачы ўраду паўнамоцтваў на ўстанаўленне таксаў для вызначэння памеру шкоды, прычыненай навакольнаму асяроддзю). Паколькі адзіную палітыку ў эканамічнай сферы і ў галіне аховы навакольнага асяроддзя праводзіць Савет Міністраў, мэтазгодна перадаць яму паўнамоцтвы на ўстанаўленне таксаў. У другім чытанні дэпутаты прынялі законапраект «Аб змене закона Рэспублікі Беларусь «Аб геадэзічнай і картаграфічнай дзейнасці». У дакуменце ўдакладняюцца асобныя тэрміны панятыйнага апарату, фармулёўкі відаў геадэзічных і картаграфічных работ дзяржаўнага і спецыяльнага прызначэння, іншыя пытанні правапрымяняльнай практыкі.

Падчас пасяджэння дэпутаты ў другім чытанні прынялі законапраект "Аб змене закона Рэспублікі Беларусь «Аб дарожным руху». «Закон «Аб дарожным руху» як медаль з двума бакамі. З аднаго боку, размова ідзе аб бяспецы дарожнага руху, а з другога — аб эфектыўнасці. Законапраект закранае інтарэсы як фізічных асоб, так і дзяржаўных органаў і арганізацый», — сказаў **старшыня Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Палаты прадстаўнікоў Ігар КАМАРОЎСКІ**.

У другім чытанні дэпутатамі быў прыняты законапраект «Аб змяненні Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь». Праектам закона ўзмацняецца крымінальная адказнасць за дзеянні, накіраваныя на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы краіны. Прапануецца караць за «заклікі, накіраваныя на прымяненне мер абмежавальнага характару (санкцый) у дачыненні да Рэспублікі Беларусь, фізічных і юрыдычных асоб». «Мы бачым, што зноў пачынаецца хваля заклікаў да санкцый у адносінах да кампаніі «Беларусь», нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў, калійнай галіны. Гэта дастаткова наспелы законапраект, і ён павінен працаваць», — сказаў намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Ігар Мартынаў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Акцэнты

# «МЫ НЕ МОЖАМ МАЎЧАЦЬ І ЗАСТАВАЦЦА ЎБАКУ»

## Бо ў выніку такой «палітыкі» рэальна церпяць простыя людзі

**Учора адбылося пасяджэнне членаў Прэзідыума Савета Рэспублікі і прадстаўнікоў пярвічнай арганізацыі Беларускага саюза жанчын сакратарыята Савета Рэспублікі. У цэнтры ўвагі — сітуацыя з мігрантамі, якая склалася каля заходніх граніц нашай краіны.**

Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента, на пасяджэнні выказвалася занепакоенасць паводзінамі польскіх улад, якія допускаюць факты дыскрымінацыі ў дачыненні да мігрантаў, уключаючы прымяненне слёзатачывага газу і іншых спецсродкаў, запалохванне зброяй і сабакамі. Зараз, згодна з папярэднімі данымі, каля польскіх граніц знаходзіцца каля 500 дзяцей. Цяпер яны абмежаваныя ў элементарных выгодах — пітной вадзе, прадуктах харчавання. З улікам умоў надвор'я, якія змяніліся, існуе рэальная пагроза не толькі здароўю, але і жыццю.

Таксама ўдзельнікі пасяджэння выказалі абурэнне адносна ігнаравання сітуацыі Еўрапейскім саюзам, які традыцыйна пазіцыянуе сябе як галоўны праваднік правоў чалавека і змагар за ліберальныя каштоўнасці.

— Беларусы як ніхто ведаюць цану міру і бяспекі. Тэрыторыя нашай краіны неаднаразова станавілася арэнай узброеных сутыкненняў, развязаных не намі і не па нашай віне. Таму мы заўсёды востра перажываем несправядлівасць, абыякавасць да чалавечай бяды і таптанне на ўсім, што называецца чалавечнасцю. Мы не можам маўчаць і заставацца ўбаку. Бо, на жаль, у выніку такой «палітыкі» рэальна пакутуюць простыя людзі, — адзначыла **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА**.

Трэба сказаць, што ў гэты ж дзень дэлегацыя ад Савета Рэспублікі і першаснай арганізацыі ГА «БСЖ» выехала на пагранічную тэрыторыю для непасрэднага вывучэння сітуацыі і аказання гуманітарнай дапамогі пры неабходнасці. Па выніках будуць выпрацаваны і прыняты адпаведныя меры, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

* * *

### «ГЭТА САПРАЎДНАЯ ГУМАНІТАРНАЯ КАТАСТРОФА»

**Члены Прэзідыума Савета Рэспублікі выступілі са зваротам у сувязі з сітуацыяй на граніцы.**

— Мы, члены Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, упаўнаважаныя прадстаўнікі беларускага народа, звяртаемся да ўсёй міжнароднай супольнасці ў сувязі з міграцыйнай сітуацыяй на беларуска-польскай граніцы. Вялікая колькасць грамадзян краін Блізкага Усходу, якія імкнуцца патрапіць у Еўрасаюз, вымушана знаходзіцца ў нечалавечых умовах, — адзначаецца ў звароце.

Сенатары звяртаюць увагу, што, паверыўшы ў шчырасць заяў еўрапейскіх урадаў, мігранты паставілі на кон усё, што ў іх было, і накіраваліся ў краіны Еўрасаюза з апошняй надзеяй здабыць лепшае жыццё. Аднак на польскай граніцы яны сутыкаюцца з плотам з калючага дроту, агрэсіўным і прыніжальным чалавечую годнасць стаўленнем да сябе.

— Гэта сапраўдная гуманітарная катастрофа, дзе няма месца ні агульнапрызнаным прынцыпам міжнароднага права, ні канвенцыям па правах бежанцаў, ні агульначалавечым каштоўнасцям і нормам паводзін, — акцэнтуецца ўвага ў дакуменце.

Парламентарыі нагадваюць, што на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў «калектыўны» Захад пераконваў увесь свет у сваёй маральнай перавазе, бравіраваў дасягненнямі ў галіне правоў чалавека і сацыяльнай камунікацыі. Аднак у выпадку з міграцыйным пытаннем пастулаты Еўрасаюза пакуль не ўдалося даказаць на справе. Падрываюцца добрасуседскія адносіны, ствараюцца рызыкі магчымага разрыву Заходняй і Усходняй цывілізацый.

Члены Прэзідыума Савета Рэспублікі нагадваюць, што для беларусаў заўсёды былі, ёсць і застануцца галоўнымі каштоўнасцямі мір і бяспека.

Беларускія парламентарыі заклікалі нацыянальныя ўрады краін Еўрасаюза выканаць раней дадзеныя людзям абяцанні. Еўрадэпутатаў, міжнародныя арганізацыі і ўсіх тых, хто яшчэ не страціў пачуццё чалавечнасці, заклікалі аб'ектыўна ацаніць сітуацыю і не заставацца ўбаку, калі гаворка ідзе аб жыцці і дабрабыце людзей.

— Людзі XXI стагоддзя заслугоўваюць жыць у міры і згодзе! — гаворыцца ў звароце.

* * *

### НАТАЛЛЯ КАЧАНАВА АБ СІТУАЦЫІ З МІГРАНТАМІ: «МЫ ЗРОБІМ УСЁ, КАБ ЗАХАВАЦЬ МІР І СПАКОЙ У НАШАЙ КРАІНЕ»

— Гэта сітуацыя не можа не хваляваць, ніводнага чалавека ў нашай краіне, — выказала свой пункт гледжання спікер верхняй палаты беларускага парламента. — Тое бязладдзе, якое адбываецца ў адносінах да мігрантаў, — гэта бесчалавечна.

— Канешне, мы не можам спакойна назіраць за тым, што адбываецца побач з граніцамі нашай краіны: міралюбівай, якая заўсёды імкнулася да міру, згоды, якая ніколі на дапускала зневажання правоў чалавека. Мы заўсёды стаялі на тым, каб людзі жылі ў міры і згодзе, разумеючы і памятаючы сваю гісторыю. Таму мы, члены Савета Рэспублікі, не можам проста глядзець на гэта, — сказала Наталля Качанава.

Разам з тым яна звярнула ўвагу на тое, што ў крызісе імкнуцца абвінавачваць Беларусь:

— У нас даўно прыняты закон, які дазваляе жыхарам 80 краін прыязджаць да нас без віз, і людзі могуць ехаць туды, куды захочуць, — кажа Наталля Качанава. — Мы гэтых людзей не запрашалі да сябе ў краіну, яны едуць у Еўрасаюз, яны бягуць ад вайны: іх запрасілі, яны едуць на працу, яны жадаюць жыць у міры ў еўрапейскіх краінах.

— Таму мы абураны паводзінамі (Еўрасаюза. — **Аўт.**), і гэта трэба спыняць. І мы зробім усё, што ад нас залежыць, каб захаваць мір і спакой у нашай краіне. А лжываму, неабгрунтаванаму абвінавачанню, якое гучыць у адрас Беларусі, мы павінны паставіць заслону, — сказала Наталля Качанава, згадаўшы прыняты Прэзідыумам Савета Рэспублікі зварот.

— Гэты зварот мы накіруем ва ўсе міжнародныя арганізацыі з мэтай данесці праўду аб тым, што адбываецца на граніцах з нашай краінай, — звярнула яна ўвагу.

Акрамя таго, па словах Наталлі Качанавай, пярвічная арганізацыя ГА «БСЖ», створаная ў Савеце Рэспублікі, плануе сумесна з іншымі пярвічнымі арганізацыямі ўсёй краіны гэтага грамадскага ад'яднання прыняць зварот ад імя беларускіх жанчын.

* * *

### ГУМАНІТАРНЫ ГРУЗ — МІГРАНТАМ

Аб гэтым журналістам паведаміў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ.

Паводле яго слоў, на граніцы, куды выехалі беларускія сенатары, мігрантам будзе перададзены гуманітарны груз, які падрыхтавалі члены Савета Рэспублікі. Ён складаецца з прадуктаў харчавання, адзення для дзяцей і дарослых і ўсяго таго, што вельмі неабходна зараз гэтым людзям.

Як стала вядома, да фарміравання грузу падключыліся і сталічнае прадпрыемства «Камунарка».

Разважаючы аб спосабах вырашэння складанай сітуацыі, якая здарылася на беларуска-польскай граніцы, Віктар Лісковіч падкрэсліў:

— Вельмі важна, каб любыя праблемы, якія ёсць у грамадстве, вырашаліся мірным шляхам не ў шкоду здароўю і тым больш не кажучы аб гібелі людзей, — пераканаы ён. — Сярод бежанцаў шмат дзяцей. Каля трох тысяч бежанцаў, якія сабраліся на беларуска-польскай граніцы, даюць нам усім нагоду асэнсаваць, што адбываецца, і ўрэгуляваць праблему мірным шляхам. Людзі, якія хочуць сёння трапіць па той бок граніцы, павінны быць у цяпле, накормлены, і, канешне ж, іх меркаванне павінна быць улічана. Я спадзяюся, што інцыдэнт, якія адбываецца, будзе вырашаны мірным шляхам і на карысць людзей, якія адчуваюць сябе абяздоленымі.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Кантэкст

# «КОЛЬКІ НАМ ЯШЧЭ ПАКУТАВАЦЬ?»

## Насупраць лагера мігрантаў выстраіўся ланцуг польскіх сілавікоў, сцягнута тэхніка, у тым ліку і баявая

**Група бежанцаў, большасць з якіх з'яўляюцца курдамі, працягвае знаходзіцца перад польскім плотам, яны разбілі лагер непасрэдна на граніцы і цяпер не прадпрымаюць якіх-небудзь агрэсіўных дзеянняў.**

«Холадна, мы ноч не спалі. Колькі мы яшчэ будзем пакутаваць? Перадайце, што мы ідзём не ў Польшчу, няхай нас прапусцяць», — звярнуўся да нашага калегі з БелТА адзін з бежанцаў. Мігрант, бацька шасцярых дзяцей, папрасіў дапамагчы яму з малаком, памперсамі, сродкамі гігіены для малых. «А яшчэ нам патрэбна вада. Вада — гэта жыццё», — заўважыў адзін з бежанцаў.

Парушэнняў заканадаўства з боку мігрантаў не зафіксавана. Аб гэтым заявіў журналістам міністр унутраных спраў Іван Кубракоў, паведаміла БелТА. Паводле слоў міністра, задача органаў унутраных спраў па ахове грамадскага парадку забяспечваецца як у Мінску, так і ў прыгранічных раёнах. «Хачу адзначыць, што на сёння ў Беларусі нейкіх праблем, звязаных з паводзінамі мігрантаў, няма», — заўважыў Іван Кубракоў.

Насупраць лагера мігрантаў выстраіўся ланцуг польскіх сілавікоў, сцягнута тэхніка, у тым ліку і баявая. Да лініі граніцы з боку Польшчы не дапускаюць прадстаўнікоў СМІ, міжнародных праваабарончых і гуманітарных арганізацый для аказання дапамогі людзям, якія імкнуцца падаць прашэнні аб атрыманні статусу бежанца на тэрыторыі ЕС.

Тым часам Беларускі саюз журналістаў выказаў рашучы пратэст дзеянням польскіх улад па перашкаджэнні работы беларускіх і замежных журналістаў па асвятленні міграцыйнага крызісу. Пра гэта гаворыцца ў заяве БСЖ, размешчанай у тэлеграм-канале саюза. «Практыкі польскага палітычнага рэжыму і сілавых структур парушаюць базавыя дэмакратычныя стандарты свабоды слова і СМІ, ігнаруюць фундаментальныя абавязацельствы Польшчы ў рамках ААН, АБСЕ і Савета Еўропы па гуманітарным вымярэнні і правах журналістаў, маюць усе прыкметы таталітарнага падаўлення правоў уласных грамадзян на доступ да аб'ектыўнай інфармацыі з зоны бядотнага становішча мігрантаў і бежанцаў», — гаворыцца ў заяве.

На думку Міністэрства абароны, размяшчэнне 10 тысяч польскіх ваеннаслужачых каля польска-беларускай граніцы (як было заяўлена міністрам нацыянальнай абароны Польшчы) з'яўляецца істотнай ваеннай дзейнасцю. «Ажыццяўленне такой дзейнасці без інфармавання беларускага боку з'яўляецца парушэннем двухбаковых дадатковых дамоўленасцяў аб рэгіянальных мерах даверу і бяспекі. Названымі дамоўленасцямі прадугледжваецца накіраванне паведамлення і запрашэнне наглядальнікаў за ваеннай дзейнасцю, у якой прымаюць удзел 6 тысяч і больш ваеннаслужачых», — звярнулі ўвагу ў ваенным ведамстве. «Да гэтага моманту Мінск не атрымаў ад польскага боку ні паведамлення, ні запрашэння наглядальнікаў», — падкрэслілі ў Мінабароны.



Фота БелТА.

Беларусь загадзя перасцерагае польскі бок ад выкарыстання любых правакацый, накіраваных супраць Беларусі, для апраўдання магчымых незаконных сілавых дзеянняў у адносінах да абяздоленых бяззбройных людзей. Аб гэтым заявілі ў прэс-службе Міністэрства замежных спраў, адказваючы на пытанне журналістаў. Рэзкае абвастрэнне міграцыйнай сітуацыі ў беларуска-польскім прыгранічны, на думку МЗС, выклікае значную занепакоенасць лёсамі людзей, якія імкнуцца любымі шляхамі і спосабамі трапіць у краіны Еўрапейскага саюза. І гэта з'яўляецца непасрэдным вынікам доўгага ігнаравання афіцыйнай Варшавай аб'ектыўнай рэальнасці, адкрыта страусавых падыходаў да вырашэння значных праблем. «На гэтым фоне вельмі няскладна выглядаюць няслушныя спробы польскага боку перакласці на Беларусь адказнасць за міграцыйную сітуацыю, што дынамічна развіваецца, — лічаць у МЗС. — Мы неаднаразова заклікалі нашых суседзяў да прадметнага дыялогу і канструктыўнага ўзаемадзеяння паміж профільнымі ведамствамі па важных трансгранічных пытаннях, якія маюць безумоўны агульны інтарэс».

**Пётр ДУНЬКО.**

# МІЖРЭГІЯНАЛЬНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА СТАЛА НОВЫМ ПУНКТАМ РОСТУ Ў АДНОСІНАХ БЕЛАРУСІ І КІТАЯ



## «ПА ДАМОЎЛЕНАСЦІ СІ ЦЗІНЬПІНА І АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ»

***— Спадар пасол, якая галоўная мэта правядзення Года рэгіёнаў?***

— Правядзенне Года рэгіёнаў Кітая і Беларусі ў гэтым і наступным годзе з'яўляецца важнай дамоўленасцю, дасягнутай Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам і Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам падчас тэлефоннай размовы сёлета ў студзені. Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва становіцца ўсё больш важным складальнікам кітайска-беларускіх адносін. Мы рады адзначыць, што ўсе шэсць абласцей Беларусі і горад Мінск устанавілі пабрацімскія адносіны з адпаведнымі правінцыямі і гарадамі Кітая. Рэгіёны дзвюх краін актыўна ажыццяўляюць супрацоўніцтва і абмены ў сферах эканомікі і гандлю, навукі і тэхналогій, адукацыі і культуры, медыцыны і аховы здароўя і дасягнулі шэрага выдатных вынікаў, адыграўшы незаменную ролю ў прасоўванні дзелавога ўзаемадзеяння, культурных абменаў і ўмацаванні сяброўства паміж дзвюма краінамі.

**За 30 гадоў нашы краіны сталі насамрэч блізкімі братамі, добрымі партнёрамі, супрацоўніцтва якіх прыносіць узаемную выгаду, а таксама сталі добрымі сябрамі, якія часта бываюць адзін у аднаго ў гасцях. У нас ёсць усе падставы меркаваць, што народы Кітая і Беларусі будуць ісці поплеч і адкрыюць наступны залаты этап двухбаковых адносін.**

***— Якія мерапрыемствы пройдуць у межах гэтага глабальнага міждзяржаўнага праекта?***

— У рамках Года рэгіёнаў Кітай і Беларусь плануюць рэалізаваць больш за 100 разнастайных міжрэгіянальных праектаў супрацоўніцтва і абменаў з удзелам большасці правінцый і гарадоў Кітая, усіх 6 абласцей і сталіцы Беларусі, а таксама асноўных дзяржаўных ведамстваў дзвюх краін. Запланаваныя мерапрыемствы ўключаюць цырымоніі падпісання пагадненняў аб устанаўленні пабрацімскіх адносін, дзелавыя сустрэчы прадпрыемстваў, эканамічныя форумы, міжнародныя выстаўкі, форумы навукова-тэхнічных інавацый, культурныя фестывалі, тыдні музыкі, фотавыстаўкі, мерапрыемствы, якія прасоўваюць традыцыйную медыцыну, навуковыя семінары, абмены сродкаў масавай інфармацыі і іншыя мерапрыемствы.

У нас ёсць усе падставы меркаваць, што рэгіёны дзвюх краін будуць падтрымліваць канцэпцыю ўзаемнай выгады і прытрымлівацца мэты сумеснага падзелу вынікаў супрацоўніцтва, скарыстаюцца магчымасцю правядзення Года рэгіёнаў Кітая і Беларусі, каб надаць яшчэ большы імпульс міжрэгіянальнаму супрацоўніцтву і зрабіць яго новым пунктам росту дзелавога ўзаемадзеяння дзвюх краін, а таксама ўнесці свой уклад у павышэнне якасці кітайска-беларускіх адносін.

***— Як вы можаце ахарактарызаваць беларуска-кітайскае супрацоўніцтва на дадзеным этапе? Наколькі зносіны і абмен думкамі паміж кіраўнікамі дзвюх дзяржаў па шэрагу ключавых пытанняў садзейнічаюць далейшаму паглыбленню супрацоўніцтва?***

— Дзякуючы стратэгічнаму кіраўніцтву і асабістаму клопату кіраўнікоў дзвюх дзяржаў кітайска-беларускія адносіны даверна-га ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва дынамічна развіваюцца. Сяброўства становіцца мацнейшым дзень пры дні. Двухбаковае супрацоўніцтва ў розных галінах працягвае паглыбляцца. Абодва бакі ўмацоўваць палітычны ўзаемадавер, цесна ўзаемадзейнічаюць у міжнародных справах і цвёрда падтрымліваюць адзін аднаго па пытаннях, якія закранаюць карэнныя інтарэсы і важныя заклапочанасці нашых дзвюх краін. Кітайскі бок цвёрда падтрымлівае беларускі бок у абароне свайго дзяржаўнага суверэнітэту і нацыянальнай годнасці, процідзейнічае ўмяшанню знешніх сіл ва ўнутраныя справы Беларусі, выступае супраць неабгрунтаваных аднабаковых санкцый супраць Беларусі і паважае шлях развіцця, абраны беларускім народам у адпаведнасці са сваімі нацыянальнымі прыярытэтамі.

Дзелавое супрацоўніцтва паміж дзвюма дзяржавамі дасягнула бліскучых поспехаў, пераадолела выклікі жорсткай пандэміі COVID-19 і занепад сусветнай эканомікі. Уражвае агульны аб'ём кітайска-беларускага тавараабароту, які са студзеня да верасня гэтага года дасягнуў 2,809 мільярда долараў ЗША, павялічыўшыся на 34,1 працэнта ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам. Дасягнуты новы прагрэс у будаўніцтве Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка, які стаў узорным праектам ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях». Паміж дзвюма краінамі наладжана ўражальнае культурна-гуманітарнае супрацоўніцтва. У Беларусі функцыянуюць заснаваныя Кітаем шэсць інстытутаў Канфуцыя і Кітайскі культурны цэнтр у Мінску. Колькасць замежных студэнтаў, якія навучаюцца па абмене ў абедзвюх краінах, увесь час павялічваецца. Кітайска-беларускія дружалюбныя абмены становяцца ўсё больш шчыльныя.

Супрацьэпідэмічнае супрацоўніцтва адрозніваецца высокай эфектыўнасцю. Нашы краіны аказваюць адна адной медыцынскую дапамогу, а таксама абменьваюцца вопытам барацьбы з эпідэміяй. Урад Кітая бязвыплатна перадаў беларускаму боку тры партыі вакцын супраць COVID-19 агульным аб'ёмам у 900 тысяч доз і неўзабаве перадасць чацвёртую партыю, што дае Беларусі надзейную гарантыю ў барацьбе з эпідэміяй і забеспячэннем бяспекі людзей, а таксама адлюстроўвае высокі ўзровень кітайска-беларускіх адносін і шчырае сяброўства паміж двума народамі.

Не так даўно першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Мікалай Снапкоў заўважыў, што «фактычна на новы этап мы ўжо выйшлі, рашэнне па замацаванні дэ-юрэ новага ўзроўню адносін — за Прэзідэнтам Беларусі і Старшынёй Кітайскай Народнай Рэспублікі». Я цалкам з гэтым згодны. У нас ёсць усе падставы меркаваць, што абавязкова павысіцца якасць кітайска-беларускіх адносін усебаковага стратэгічнага партнёрства, а супрацоўніцтва ў розных сферах адкрые новыя перспектывы развіцця.

## «АБ'ЁМ ГАНДЛЮ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ Ў 87 РАЗОЎ»

***— Нашы краіны ў хуткім часе адзначаць 30-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін. Чым адметны гэты час? Якія вашы чаканні і бачанне далейшага развіцця беларуска-кітайскага супрацоўніцтва?***

— Кітай — адна з першых краін, якія прызналі незалежнасць Беларусі і ўстанавілі дыпламатычныя адносіны з ёй. Далейшае ўмацаванне супрацоўніцтва ў якасці ўсебаковых стратэгічных партнёраў змагла не толькі эфектыўна абараніць агульныя інтарэсы абодвух бакоў, але і аб'яднаць намаганні для абароны міжнароднай бессаронасці і справядлівасці. 30-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Кітаем і Беларуссю будзе адзначацца 20 студзеня наступнага года. За гэты час кітайска-беларускія адносіны вытрымалі выпрабаванне міжнароднай абстаноўкі, якая хутка змяняецца, а таксама ад пачатку і да цяперашняга моманту адрозніваюцца эфектыўнасцю і поўныя жыццёвых сіл.

**У жніўні гэтага года кітайская кампанія ТАА «Новаэра Біятэх» і Цэнтр экспертыз і выпрабаванняў у ахове здароўя Рэспублікі Беларусь падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве, зрабіўшы першы крок у сумеснай распрацоўцы і вытворчасці Кітаем і Беларуссю спецыяльных прэпаратаў для лячэння COVID-19. Цяпер пры падтрымцы і садзейнічанні Пасольства КНР і Міністэрства аховы здароўя распрацаваная дадзенай кампаніяй капсула «Цын'і», якая валодае добрай эфектыўнасцю ў лячэнні COVID-19. Яна ўжо атрымала дзяржаўную рэгістрацыю прэпарату і дазвол на вытворчасць, выдадзены Міністэрствам аховы здароўя, а таксама была прадстаўлена ў Кітаі на чацвёртым Кітайскім міжнародным імпартным ЭКСПА ў Шанхаі.**

Палітычныя адносіны дынамічна развіваюцца. За апошнія 30 гадоў колькасць візітаў прадстаўнікоў найвышэйшага ўзроўню ўлады дзвюх краін дзяржавы перавысіла шэсцьдзясят. Старшыня КНР Сі Цзіньпін двойчы наведваў Беларусь, 13 разоў сустракаўся з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам, які ў сваю чаргу 13 разоў наведваў Кітай або прысутнічаў на мерапрыемствах у КНР. Узровень кітайска-беларускіх адносін тройчы павышаўся: з «сяброўскіх адносін супрацоўніцтва» да «адносін усебаковага стратэгічнага партнёрства» і ў выніку да «адносін даверна-га ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва». Абодва бакі стварылі дзейсныя механізмы ўзаемадзеяння, у тым ліку Кітайска-Беларускі міжурадавы камітэт па супрацоўніцтве, цесна ўзаемадзейнічаюць у міжнародных і рэгіянальных справах, абараняюць агульныя інтарэсы дзвюх краін і ўнеслі важны ўклад ва ўмацаванне рэгіянальнага і глабальнага міру і бяспекі.

Эканамічнае ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва паміж Кітаем і Беларуссю выходзіць на новы ўзровень. Аб'ём двухбаковага гандлю вырас з 33,9 мільёна долараў ЗША на момант устанаўлення дыпламатычных адносін да трох мільярдаў долараў ЗША, павялічыўшыся ў 87 разоў. Абодва бакі карыстаюцца магчымасцю сумеснага будаўніцтва «Аднаго пояса, аднаго шляху» для ўсебаковага павышэння ўзроўню супрацоўніцтва ў гандлі, інвестыцыях, навуцы і тэхналогіях, будаўніцтве інфраструктуры і іншых галінах. Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень» стаў найбуйнейшым замежным аб'ектам такога тыпу, створаным кітайскімі прадпрыемствамі, і ўяўляе сабой сімвалічны і ўзорны праект супрацоўніцтва дзвюх краін у сумесным будаўніцтве «Аднаго пояса, аднаго шляху». Праект «БЕЛДЖЫ» па зборцы камплектуючых запоўніў прабел у вытворчасці легкавых аўтамабіляў у Беларусі і дапамог вашай краіне рэалізаваць сваю мару па вытворчасці ўласных легкавікоў. Кітайскія электрапрыборы ўвайшлі ў тысячы дамоў Беларусі, а беларускія высакаякасныя малочныя і іншыя сельскагаспадарчыя прадукты карыстаюцца вялікім попытам у жыхароў Кітая.

У галіне культурна-гуманітарных абменаў таксама адзначаецца заўважная дынаміка. Абодва бакі стварылі розныя платформы для эфектыўнага абмену і ўсталявалі сяброўскія каналы для сувязі паміж народамі, паспяхова арганізавалі Год турызму, Год адукацыі, а таксама неаднаразова праводзілі Дні культуры, Тыдні кіно, выстаўкі карцін. Усе гэтыя мерапрыемствы паглыбілі паразуменне і культурную інтэграцыю двух народаў. У 2018 годзе афіцыйна ўступіла ў сілу Пагадненне паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Кітайскай Народнай Рэспублікі аб узаемным бязвізавым рэжыме для ўладальнікаў звычайных пашпартоў, што непасрэдна аблегчыла і садзейнічала культурна-гуманітарным абменам паміж дзвюма краінамі. Канцэпцыя дружбы паміж Кітаем і Беларуссю, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне, глыбока ўкаранілася ў сэрцах людзей нашых краін.

Кітайска-беларускае міжрэгіянальнае супрацоўніцтва працягвае адкрываць новыя перспектывы. Па меры паглыблення адносін усё больш і больш кітайскіх правінцый і гарадоў накіроўваюць свае дэлегацыі ў Беларусь. Зараз устаноўлены 33 пары пабрацімскіх адносін па лініі гарадоў і абласцей. Падчас дзяржаўнага візіту Старшыні КНР Сі Цзіньпіна ў Беларусь у 2015 годзе ў Мінску паспяхова адбыўся Кітайска-Беларускі міжрэгіянальны бізнес-форум. Рэгіёны і прадпрыемствы дзвюх краін скарысталіся гэтай магчымасцю і падпісалі 25 дакументаў аб супрацоўніцтве на агульную суму амаль сем мільярдаў долараў ЗША. Роля міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ў вывучэнні новых мадэляў і новых праектаў супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі расце з кожным днём. Год рэгіёнаў Кітая і Беларусі надасць новы імпульс паглыбленню ўзаемадзеяння паміж дзвюма краінамі.

Кітайска-беларускае супрацьэпідэмічнае супрацоўніцтва працягвае дэманстраваць новыя яскравыя моманты. На фоне працяглай і неадступнай эпідэміі COVID-19 у гэтыя два гады ўзаемадзеянне Кітая і Беларусі ў сумеснай барацьбе з ёй стала ключавым напрамкам супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі. Акрамя аказання гуманітарнай дапамогі ў выглядзе супрацьэпідэмічных матэрыялаў і вакцыны, а таксама абмену вопытам барацьбы з эпідэміяй, пра якія

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*




я распавёў, ёсць яшчэ два важныя моманты кітайска-беларускага супрацоўніцтва ў гэтай сферы. Па-першае, гэта аказанне падтрымкі навукова-абгрунтаванаму даследаванню паходжання віруса і сумеснае супрацьстаянне палітызацыі дадзенага пытання. У адказ на палітычныя маніпуляцыі ЗША пад маркай даследавання паходжання віруса і іх заахвочванне і выкарыстанне разведачна-абгрунтаванага даследавання паходжання віруса Беларусь шляхам такіх спосабаў, як накіраванне ліста Генеральнаму дырэктару СААЗ і публічную заяву Міністэрства замежных спраў, неаднаразова публічна заяўляла аб супрацьстаянні палітызацыі пытання віруса і разам з Кітаем рашуча абараняе глабальнае супрацоўніцтва навукова-абгрунтаванага даследавання паходжання віруса і сусветную згуртаванасць у барацьбе з эпідэміяй.

**Не так даўно першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Мікалай Снапкоў заўважыў, што «фактычна на новы этап мы ўжо выйшлі, рашэнне па замацаванні дэ-юрэ новага ўзроўню адносін — за Прэзідэнтам Беларусі і Старшынёй Кітайскай Народнай Рэспублікі». Я цалкам з гэтым згодны. У нас ёсць усе падставы меркаваць, што абавязкова павысіцца якасць кітайска-беларускіх адносін усебаковага стратэгічнага партнёрства, а супрацоўніцтва ў розных сферах адкрые новыя перспектывы развіцця.**

Другі важны момант заключаецца ў супрацоўніцтве ў распрацоўцы прэпаратаў кітайскай традыцыйнай медыцыны, якія маюць добрую эфектыўнасць у лячэнні COVID-19. У жніўні гэтага года кітайская кампанія ТАА «Новаэра Бітэх» і Цэнтр экспертыз і выпрабаванняў у ахове здароўя Рэспублікі Беларусь падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве, зрабіўшы першы крок у сумеснай распрацоўцы і вытворчасці Кітаем і Беларуссю спецыяльных прэпаратаў для лячэння COVID-19. Цяпер пры падтрымцы і садзейнічанні Пасольства КНР і Міністэрства аховы здароўя распрацаваная дадзенай кампаніяй капсула «Цын'і», якая валодае добрай эфектыўнасцю ў лячэнні COVID-19. Яна ўжо атрымала дзяржаўную рэгістрацыю прэпарату і дазвол на вытворчасць, выдадзены Міністэрствам аховы здароўя, а таксама была прадстаўлена ў Кітаі на чацвёртым Кітайскім міжнародным імпартным ЭКСПА ў Шанхаі. Мы спадзяёмся, што вытворчасць капсул «Цын'і» будзе запушчана ў найбліжэйшы час у Кітайска-Беларускім індустрыяльным парку і ўнясе актыўны ўклад у барацьбу з эпідэміяй у Беларусі і суседніх краінах.

Прычына, па якой за 30 гадоў з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін кітайска-беларускія адносіны набылі такую моцную жыццяздольнасць, у тым, што іх развіццё адпавядае фундаментальным інтарэсам двух народаў і доўгатэрміновым патрэбам Кітая і Беларусі ў стабільнасці і развіцці, а таксама прынесла адчувальныя выгады абодвум бакам. Мінулыя 30 гадоў сталі сведкамі вялікіх дасягненняў у сацыяльна-эканамічным развіцці і нацыянальным будаўніцтве дзвюх краін, а таксама стабільнага развіцця кітайска-беларускіх адносін. За 30 гадоў нашы краіны сталі насамрэч блізкімі братамі, добрымі партнёрамі, супрацоўніцтва якіх прыносіць узаемную выгаду, а таксама сталі добрымі сябрамі, якія часта бываюць адзін у аднаго ў гасцях. У нас ёсць усе падставы меркаваць, што народы Кітая і Беларусі будуць ісці поплеч і адкрыюць наступны залаты этап двухбаковых адносін.

## «ДРУЖАЛЮБНАМУ НАРОДУ — ШЧАСЛІВАГА ЖЫЦЦЯ!»

***— Спадар пасол, мы ведаем, што вы працуеце ў Беларусі ўжо цэлы год, прарабілі вялікую работу па паглыбленні беларуска-кітайскага супрацоўніцтва. Аднак праз эпідэмію і па іншых прычынах, напэўна, у вас не было магчымасці наведаць розныя куткі Беларусі. Калі з'явіцца такая магчымасць, якія месцы ў нашай краіне вы хацелі б наведаць у першую чаргу?***

— Так, час ляціць незаўважна, у імгненне вока праляцеў год з таго моманту, як я прыехаў працаваць у Беларусь. За гэты год мы разам з беларускімі сябрамі з усіх колаў актыўна ўзаемадзейнічалі і працавалі, сталі сведкамі ўзгодненых намаганняў дзвюх краін на міжнароднай арэне, актыўнага развіцця кітайска-беларускага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва насуперак негатыўным сусветным тэндэнцыям, а таксама шчырай узаемадапамозе і ўзаемападтрымцы двух народаў у эпідэміі.

**Кітайскі бок цвёрда падтрымлівае беларускі бок у абароне свайго дзяржаўнага суверэнітэту і нацыянальнай годнасці, процідзейнічае ўмяшанню знешніх сіл ва ўнутраныя справы Беларусі, выступае супраць неабгрунтаваных аднабаковых санкцый супраць Беларусі і паважае шлях развіцця, абраны беларускім народам у адпаведнасці са сваімі нацыянальнымі прыярытэтамі.**

Для мяне мінулы год быў вельмі адметны. Я даведаўся яшчэ больш пра Беларусь, і ў мяне стала больш беларускіх сяброў. Беларусь — прыгожая краіна з унікальнай гісторыка-культурнай спадчынай. Беларускі народ працавіты, мудры, вельмі ветлівы і прыязны. Мне вельмі цікава ўсё больш даведвацца пра гэтую краіну і яе народ. Я шчыра спадзяюся, што ў найбліжэйшай будучыні ў мяне будзе магчымасць пабываць ва ўсіх шасці абласцях і буйных гарадах Беларусі, асабіста стаць сведкам новых поспехаў, новага развіцця і новых змен у беларускім грамадстве, эканоміцы і жыцці народа, а таксама пазнаёміцца з адметнымі беларускімі традыцыямі.

У заключэнне я хацеў бы праз газету «Звязда» і яе чытачоў перадаць прывітанне вялікай колькасці беларускіх сяброў, а таксама пажадаць брацкай Беларусі працвітання, а дружалюбнаму народу — шчаслівага жыцця!

***— Шчыры дзякуй! Нашым кітайскім братам — найлепшыя пажаданні міру і дабрабыту, разам мы здольныя на новыя перамогі!***

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

Заўжды ў страі

# ДА СЛУЖБЫ ПРЫКІПЕЎ ДУШОЙ

**Ветэран Дзяржаўтаінспекцыі — пра падрыхтоўку да XXII Алімпійскіх гульняў, верталётны ўзвод і паважлівае стаўленне да кіроўцаў**

**Для людзей у пагонах сёння адметная дата — Дзень ушанавання ветэранаў органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў МУС. Аднак супрацоўнікі, якія служылі ў гады СССР, памятаюць яго як Дзень савецкай міліцыі. Сярод іх — і Сяргей Мікалаевіч Чарніцкі, які амаль усё сваё жыццё стаяў на варце правапарадку.**

Міліцыянерам хлопец з вёскі Ушалавічы Слуцкага раёна вырашыў стаць не адразу. Перш прайшоў тэрміновую службу ў гвардзейскім палку Маскоўскай акругі супрацьпаветранай абароны. За добрасумленнае выкананне воінскага абавязку, а таксама актыўную дзейнасць на камсамольскай ніве Сяргей Чарніцкі быў датэрмінова дэмабілізаваны. Адразу пасля арміі паступіў у Беларускі політэхнічны інстытут. Будучы студэнтам, працягваў займацца камсамольскай работай.

Пасля атрымання дыплома Сяргей Чарніцкі быў накіраваны працаваць на завод, у родны Слуцкі край. Там быў абраны сакратаром партыйнай арганізацыі. Праца з малых гадоў у калгасе, служба ў войску, нялёгкія будні на заводзе, актыўная грамадская дзейнасць — усё гэта яму дало каштоўны вопыт, які спатрэбіўся ў жыцці.

У 1967 годзе Слуцкі райкам партыі накіраваў Сяргея Чарніцкага ў Вышэйшую партыйную школу ЦК Камуністычнай партыі Беларусі. Пасля яе паспяховага заканчэння случчанін прыступіў да службы ва ўпраўленні ўнутраных спраў Мінскага аблвыканкама. Спачатку працаваў у аддзеле кадраў: падбіраў спецыялістаў, запаўняў дакументацыю на прысваенне званняў, а галоўнае, прымаў непасрэдны ўдзел у выхаванні маладых міліцыянераў. Самому таксама было ў каго вучыцца: па ўспамінах Сяргея Мікалаевіча, разам з ім працавалі ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, якія з'яўляліся добрым прыкладам у прафесіі.

У 1970-х гадах Савецкі Саюз, у тым ліку Мінск, рыхтаваўся да правядзення XXII Алімпійскіх гульняў. Руку на пульсе трымала і Дзяржаўтаінспекцыя.

— Яшчэ да пачатку Гульняў супрацоўнікам ДАІ паступілі задачы абследаваць аўтамабільныя дарогі, абсталяваць іх сучаснымі дарожнымі знакамі, — успамінае Сяргей Чарніцкі. — Для праезду замежных гасцей па трасе Брэст — Масква ў межах Мінскай вобласці неабходна было забяспечыць транспартны калідор, які звязваў Захад са сталіцай Савецкага Саюза. Улічваючы вопыт замежных краін, у мэтах аператыўнага рэагавання на дарожна-транспартныя здарэнні, а таксама больш эфектыўнага ўпраўлення дарожна-патрульнай службай быў створаны асобны дывізіён ДПС ДАІ Мінаблвыканкама. Яго галоўнай задачай з'яўлялася дарожная бяспека на трасах Брэст — Масква, Мінск — Гродна, Мінск — Віцебск, дарогах Мінскага раёна.

Некаторы час гэты дывізіён, які пасля называўся асобным батальёнам дарожна-патрульнай службы, узначальваў Сяргей Чарніцкі. Кажучы пра тэхнічнае забеспячэнне падраздзялення, падпалкоўнік міліцыі ў адстаўцы згадвае, як спачатку ажыццяўлялі патрулі на старых матацыклах «Масквіч». Потым ужо з'явіўся навейшы «Урал» (з каляскай і адначасова 2-месны). Затым аўтапарк даступстваў парушэнняў ПДР, пажадай добрага шляху — кіроўца зразумее гэта на ўсё жыццё, — перакананы вопытны міліцыянер. — Залічваліся самыя грубыя парушэнні: кіраванне транспартным сродкам у нецвярозым стане, невыкананне хуткаснага рэжыму, правілы манеўравання, небяспечны абгон».

Сяргею Чарніцкаму часта задаюць пытанне, калі было лягчэй працаваць: тады (больш чым 30 гадоў таму) або цяпер. Ён заўжды адказвае так: «Дарожна-патрульная служба ніколі не была лёгкай. Але, нягледзячы на цяжкасці, многія прыкіпаюць да яе душой, аддаючы службе найлепшыя гады».




**Падпалкоўнік міліцыі ў адстаўцы Сяргей ЧАРНІЦКІ *(трэці злева)* са сваімі калегамі па службе.**

Намеснік прэм'ер-міністра закрануў тэму цэн на прадукты харчавання. «Так, ёсць сусветная тэндэнцыя росту кошту прадуктаў харчавання, але мы адсочваем сітуацыю на ўнутраным рынку, каб змяненне іх было ў рамках здаровага сэнсу. Стараемся не дапусціць росту цэн за кошт павелічэння маржынальнасці гандлёвых сетак. Асноўная мэта — каб звычайны чалавек, прыходзячы ў краму, не адчуў турбулентнасці на рынку», — падкрэсліў ён.

У сваю чаргу, **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Іван КРУПКО** паведаміў, што Беларусі ёсць чым ганарыцца і ёсць што прадэманстраваць.

«Дзякуючы падтрымцы Прэзідэнта развіваецца аграпрамысловы комплекс, шырока ўкараняецца дасягненні навукі. Сёння, паводле ацэнак Міжнароднай арганізацыі ФАО, Беларусь займае 23-е месца па забеспячэнні харчовай бяспекі са 113 краін свету. Унутраны рынак Беларусі цалкам забяспечаны прадуктамі харчавання». Міністр таксама адзначыў, што Беларусь стала буйным гульцом на знешніх рынках па экспарце харчавання.

«За папярэднія пяцігоддзе экспарт беларускіх тавараў вырас на 30 %, а знешнегандлёвае сальда павялічылася з пяці мільёнаў долараў у 2015 годзе да 1,5 мільярда долараў у 2020-м. І ў гэтым годзе таксама ідзе нарошчванне экспарту. Па выніках 9 месяцаў экспарт склаў 112,6 % да ўзроўню мінулага года», — заявіў Іван Крупко.

### ЭЛІТНЫ СЫР ЦЭЛЫ ГОД СПЕЕ

На выстаўцы карэспандэнт «Звязды» сустрэў моцнага гаспадарніка, **дырэктара камбіната «Навагрудскія дары» Аляксандра БУЛАКА**. Малочная кампанія «Навагрудскія дары» ўваходзіць у рэгіянальны холдынг «Гроднамясамалпрам». Менавіта ў экспазіцыі гэтага холдынга малочная кампанія прадэманстравала сваю прадукцыю на выстаўцы.

Сёння пад брэндам "Навагрудскія дары» выпускаецца больш за 60 найменняў прадукцыі: сыры паўцвёрдыя, мяккія, рассольныя, натуральнамалочная прадукцыя, сухое абястлушчанае і суцэльнае малако. Маючы такую лінейку, прадпрыемству лягчэй манеўраваць ва ўмовах зменлівага попыту.

З новых прадуктаў варта назваць казеін і сухую казеінавую сыроватку. Сёння яна выкарыстоўваецца ў харчовай прамысловасці: дзіцячым харчаванні, хлебапякарнай, кандытарскай, мясной галінах, пры вытворчасці кармавых прадуктаў. Як вядома, у краіне выпускаецца таксама канцэнтрат сыроватачных бялкоў з утрыманнем бялку 55 % і 80 %. Прадукт выкарыстоўваецца для вытворчасці дзіцячага і спецыялізаванага харчавання.



Паводле слоў Аляксандра Булака, на камбінаце сёння працуе 550 чалавек, якія штосутачна перапрацоўваюць каля 500 тон малака. Штомесяц тут атрымліваюць каля тысячы тон сухіх малочных прадуктаў, 550 тон суцэльнамалочнай прадукцыі (малако, смятана, кефір, тварог), вырабляецца 360 тон сыроў. Аб сыры варта расказаць асобна.

«Добрая якасць нашых сыроў у першую чаргу залежыць ад высакакласных тэхналагаў, якія ўжо шмат гадоў працуюць над стварэннем гэтага дзіўнага прадукту, — дзеліцца сакрэтам Аляксандр Іванавіч. — Сыр «PESTO», «Гаўда», «Манарх», «Эдам Навагрудскі», сыры галандскай групы. А гонар «Навагрудскіх дароў» — асаблівы, звышцвёрды сыр «Рэджаніта», які гатуецца 12 месяцаў. Варта заўважыць, што астатнія сыры адстойваюцца ад 2,5 месяца да паўгода.

Сыр з «вытрымкай» валодае глыбокім і досыць яркім смакам з пікантнай ноткай і найтанчэйшым водарам. Адметная асаблівасць — у сыру ломкая структура — ён крышыцца пры наразанні. Мы пацікавіліся: гэты вельмі смачны сыр ведаюць толькі ў Беларусі або рассмакавалі і нашы суседзі?

«Навагрудскія дары» — экспартаарыентаванае прадпрыемства. Больш за 90 % сваёй прадукцыі яно пастаўляе на экспарт. Асноўны спажывец — Расія, Казахстан, Грузія, Польшча, Літва, Германія і іншыя. Сёння попыт на гэтыя сыры велізарны. Заказаў не проста шмат, іх — праз край. Цяпер заказваюць ужо тыя сыры, якія нават яшчэ не заклалі. З пакупнікамі заключаны кантракты на гэты год і нават на наступны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Фота Аліны МАЗАВЕЦ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### 45 мільёнам чалавек пагражае галодная смерць



Паводле даных Сусветнай харчовай праграмы ААН (СХП), колькасць людзей, якія знаходзяцца на мяжы голаду, сёлета рэзка павялічылася на 3 мільёнаў чалавек у параўнанні з мінулым годам, паведаміў Цэнтр навін ААН. «Дзясяткі мільёнаў чалавек — на краі прорвы. Паказчыкі голаду растуць пад уздзеяннем канфліктаў, змены клімату і пандэміі COVID-19. Апошнія звесткі сведчаць аб тым, што 45 мільёнам жыхароў планеты пагражае галодная смерць», — пракаментаваў вынікі даследавання кіраўнік СХП Дэвід Біслі. Паводле яго слоў, людзям даводзіцца шукаць розныя спосабы, каб пракарміцца. Згодна з вынікамі апытанняў, некаторыя ўразаюць рацыён, іншыя проста прапускаюць прыёмы ежы. Дарослыя ахвяруюць сабой і днямі галадаюць — абы іх дзеці былі сытыя. Жыхары некаторых раёнаў Мадагаскара, напрыклад, вымушаны ўжываць у ежу саранчу, лісце дзікіх раслін ці кактусы. Паводле даных ААН, усё больш людзей пакутуюць ад голаду ў Афганістане, Эфіопіі, Анголе, Кеніі і Бурундзі, на Гаіці і Самалі.

### Масавы пратэст супраць COVID-абмежаванняў прайшоў у Новай Зеландыі

Каля 3 тысяч чалавек узялі ўдзел у акцыі пратэсту супраць абмежаванняў у сувязі COVID-19 у Велінгтане. Аб гэтым паведаміла новазеландскае радыё. Пратэстоўцы, у асноўным без медыцынскіх масак, прайшлі па вуліцах горада да будынка парламента, выкрыкваючы лаянкі ў адрас паліцэйскіх і прадстаўнікоў прэсы. Акрамя таго, у праваахоўнікаў стралялі з вадзяных пісталетаў і закідвалі тэніснымі мячыкамі. Дэманстранты разышліся, выканаўшы каля будынка парламента хаку — баявы танец карэннага народа краіны маоры. «Тое, што адбылося сёння, нехарактэрна для пераважнай колькасці новазеландцаў», — пракаментавала пратэст прэм'ер Новай Зеландыі Джасінда Ардэрн. Яна нагадала, што большасць жыхароў падтрымалі ўведзеныя ўрадам абмежавальныя меры, улічваючы, што амаль 90 працэнтаў насельніцтва атрымалі прынамсі адну дозу вакцыны.



Дзеля памяці беларускага пісьменніка

# ШУКАЛЬНІК ЖЫЦЦЁВЫХ ІСЦІН



**8 лістапада пайшоў з жыцця паэт, празаік, публіцыст Ганад ЧАРКАЗЯН. Нарадзіўся ў кастрычніку 1946 года...**

Ён, курд па нацыянальнасці, армянін па месцы нараджэння, пішучы на роднай мове, друкуючыся ў перакладах на рускую і беларускую мовы, вельмі не любіў, калі яго называлі курдскім пісьменнікам. Не таму, што не любіў свой народ. Наадварот — быў і, відавочна, застаўся патрыётам сваёй старонкі, хаця ці не паўвека жыцця аддаў Беларусі. Ён прасіў называць яго беларускім пісьменнікам... Мо таму і цягнуўся найболей да паэтаў і празаікаў, якія пісалі, пішуць па-беларуску.

Першыя яго кнігі ўхвалілі, напісалі да іх уступныя словы, выказаліся аб іх у друку народны паэт Беларусі Пятрусь Броўка, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Алег Лойка, народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў. Многія паэтычныя творы Ганада Чарказяна на беларускую мову пераклаў народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін. Ганад Бадрыевіч паспеў напісаць успаміны эсэістычнага характару пра сваіх настаўнікаў у жыцці, літаратуры — П. Броўку, В. Быкава, Р. Барадуліна, А. Лойку. Ён вельмі даражыў сяброўствам з гэтымі яркімі, адметнымі асобамі.

Надзвычай шмат для папулярызацыі творчасці Ганада Чарказяна зрабілі перакладчыкі яго твораў: на рускую мову — Валерый Ліпневіч, на беларускую — Казімір Камейша.

Адметнай рысай у творчасці Ганада Чарказяна было жаданне распавесці пра свой народ, яго звычаі, пра тое, якімі маральнымі, духоўнымі традыцыямі, крытэрыямі кіраваліся яго суродзічы ў звычайным, побытавым жыцці. З кніг пісьменніка выбудавалася немалая бібліятэка: «Трываласць», «Колер дабрыні», «Прастора часу», «Плач», «Караваны гор», «Чаргаві», «Дом дажджу», «Сум па дому», «Зорная глыбіня», «Мелодыя расстання», «Апярэдзіць смерць»...

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# АПЕРАЦЫЯ
## АБО ЗАЛАТАЯ ЛІХАМАНКА

**Усесаюзнае аб'яднанне па гандлі з замежнікамі на тэрыторыі СССР (скарочана Таргсін) было заснавана савецкім урадам у ліпені 1930 г. з мэтай прыцягнуць дадатковыя валютныя сродкі для індустрыялізацыі. Паводле задумы Наркамата знешняга гандлю, крамы Таргсіна павінны былі прапаноўваць замежнікам якасныя тавары за цвёрдую валюту. Савецкім грамадзянам уваход у іх забараняўся. Першапачаткова падобны гандаль разгарнулі ў гасцініцах Масквы і Ленінграда, а таксама ў партовых гарадах краіны. Сціплыя вынікі першага года цэнтралізаванага валютнага гандлю з замежнікамі прымусілі адчыніць у верасні 1931 г. дзверы Таргсіна для грамадзян СССР. Першыя савецкія пакупнікі маглі аплаціць свае набыткі грашовымі пераводамі замежных сваякоў або з уласных рахункаў у замежных банках.**



### Ударнікі-таргсінаўцы і арышт пенсіянера Рубіса

Рэалізацыя планаў першай пяцігодкі спустошыла залаты запас краіны. Валюты для набыцця за мяжой абсталявання, тэхналогій, аплаты працы спецыялістаў не хапала. Палітбюро ЦК УсеКП(б) шукала ўсе магчымасці для прыцягнення золатавалютных сродкаў — ад долараных «апарняў» для нэпманаў у АДПУ да продажу за мяжу музейных шэдэўраў. У гэтым шэрагу Таргсін з'яўляўся толькі адным са сродкаў пераадолення валютнага крызісу. Яго значнасць рэзка ўзрасла пасля таго, як у снежні 1931 г. Савет Народных Камісараў СССР дазволіў гандаль з савецкімі грамадзянамі за пабытавае золата. Цяпер кожны мог абмяняць залатыя манеты, ювелірныя вырабы, прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на дэфіцытныя прамтавары і прадукты.

Механізм гэтага абмену выглядаў наступным чынам. Людзі прыносілі ў прыёмныя пункты каштоўнасці, якія ацэньваліся ў залатых таргсінаўскіх рублях. Залатыя рублі выконвалі функцыю ўмоўных разліковых адзінак і ніколі не існавалі ў фізічным выглядзе. У якасці плацежных сродкаў, якія спраўджвалі здачу валютных каштоўнасцяў, выкарыстоўваліся таварныя ордэры Таргсіна (ТОТ).

Пасля таго, як Таргсін стаў даступны для савецкага пакупніка, сетка крамаў аб'яднання распаўсюдзілася па ўсёй краіне. Савецкая Беларусь не была выключэннем. Створаная 6 кастрычніка 1931 г. Беларуская кантора Таргсіна да сярэдзіны 1932 г. адкрыла універмаг ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Магілёве, Бабруйску, Клімавічах, Полацку, Мазыры, Оршы, Слуцку і Барысаве. Свае паслугі айчынным і замежным падарожнікам прапаноўвалі таксама павільёны на памежных пераходах у Бігосаве і Негарэлым. На працягу другой паловы 1932 і асабліва першай паловы 1933 г. беларуская кантора Таргсіна пашырыла сваю гандлёвую сетку да 69 пунктаў (41 універмаг, 26 ларкоў, 2 павільёны), якія ахаплівалі ўсю тэрыторыю БССР. Распачаўся фургонны гандаль на вёсках. Пры кожным гандлёвым пункце працаваў пункт скупкі каштоўных металаў (у Мінску іх было некалькі).

Адначасова з ростам гандлёвай сеткі ўскладнялася арганізацыйная структура Белканторы Таргсіна. У 1933 г. з'явіліся новыя аддзяленні ў Белканторы, сфарміравалася «куставая» структура крам, паўсталі міжраённая базы ў Мінску, Віцебску, Гомелі, Бабруйску і Оршы. У тым жа годзе з'явілася ўласная «асобая інспекцыя», пачалі выдаваць на беларускай мове бюлетэнь «Беларускі таргсінавец», адбыўся першы ўсебеларускі злёт ударнікаў-таргсінаўцаў. Акрамя Наркамата знешняга гандлю, у структуры якога знаходзіўся Таргсін, ён шчыльна супрацоўнічаў з Дзяржбанкам, куды здаваліся «нарыхтаваныя» каштоўнасці, Знешгандальбанкам, які атрымліваў грашовыя пераводы з-за мяжы, Наркаматам забеспячэння, які пастаўляў тавары і прадукты, а таксама з шэрагам іншых ведамстваў і арганізацый. Па шырокім коле пытанняў — ад інфармацыйнага забеспячэння да выкрыцця валютных махінацый — Белкантора Таргсін супрацоўнічала з АДПУ БССР.




АДПУ і Таргсін супрацоўнічалі і адначасова спаборнічалі ў справе адабрання золатавалютных каштоўнасцяў у насельніцтва. Эканамічнае ўпраўленне АДПУ, з аднаго боку, дапамагала кіраўніцтву Таргсіна лакалізаваць месцы канцэнтраванага пражывання ўладальнікаў валюты і золата, выкрывала злачынствы, здзейсненыя прадаўцамі і прыёмшчыкамі, забяспечвала транспарціроўку золата, срэбра і каштоўных камянёў. З іншага боку, вынайдзены савецкім кіраўніцтвам «негвалтоўны» метад адабрання золатавалютных каштоўнасцяў з дапамогай аб'яднання «Таргсін» аб'ектыўна памяншаў колькасць «укрывальнікаў» золата і валюты, скарачаў аб'ёмы прымусова адабраных у іх АДПУ каштоўнасцяў. У гэтай сітуацыі агенты АДПУ пачалі выкарыстоўваць Таргсін ва ўласных мэтах. Яны сачылі за здатчыкамі золата, рабіліператрусы, выклікалі на допыты, а ў пэўных выпадках арыштоўвалі іх непасрэдна ва універмагах Таргсіна. Такі лёс у жніўні 1934 г. у мінскім універмагу напаткаў добрасумленнага пераводаатрымальніка, пенсіянера Рубіса, пра арышт якога начальніку беларускай міліцыі з абурэннем паведамляю кіраўнік Белканторы Таргсіна.

Работнікі Таргсіна атрымлівалі даволі высокія заробкі. У часы, калі сярэдняя аплата працы рабочага складала каля 130 рублёў, кіраўнік Белканторы атрымліваў 550 рублёў, камерцыйны дырэктар — 300 рублёў, загадчык універмага ва Уздзе — 175 рублёў, прыбіральшчыца памяшканняў — 60 рублёў у месяц. Аднак не толькі заробкі прыцягвалі людзей на працу ў аб'яднанне «Таргсін». Важнасць дзяржаўнай задачы, якую ён выконваў у імя індустрыялізацыі, была ацэнена ў выглядзе т. зв. залатых пайкоў — штомесячных набораў прадуктаў на 12 таргсінаўскіх рублёў. Была і іншая, больш прагматычная мэта ўвядзення дадзенай формы стымулявання працы работнікаў Таргсіна, а менавіта прадухіленне раскрадання валютных тавараў ва ўмовах татальнага дэфіцыту. У «залаты паёк» уваходзілі «экспартныя» тавары, такія як мука, крупы, мяса, рыба, масла, сыр, гарбата.

### Голад і залатыя горы

Найважнейшым кірункам работы Таргсіна была «нарыхтоўка» золатавалютных каштоўнасцяў у насельніцтва. Золата ў скупачных пунктах прымалася ва ўсіх выглядах — ювелірных, мастацкіх і пабытавых вырабах, манетах, злітках, пяску (шліхту) і інш. Забаранялася прымаць толькі царкоўнае начынне, якое лічылася дзяржаўнай, нацыянальнай маёмасцю, але гэтае правіла часта парушалася. Прыёмшчыкі ператваралі ўсе залатыя прадметы ў «лом», не зважаючы на іх гістарычную, мастацкую або сацыяльную значнасць (выключэнне складалі шэдэўры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва накшталт яек Фабержэ). У арыгінальным выглядзе пакідалі залатыя манеты, якія праходзілі ў афіцыйнай справаздачнасці пад назвай «чакан». Пасля дастаўкі нарыхтаванага лому і чакану ў Маскву яны пераплаўляліся ў залатыя злiткі — сродкі плацяжу за трактары і станкі.

Таргсін плаціў 1,29 таргсінаўскага рубля (паводле афіцыйнага курса, 1 таргсінаўскі рубель быў роўны 6,6 звычайным савецкім рублям) за грам хімічна чыстага золата. Манеты без пашкоджанняў прымаліся па намінальным кошце, дэфектныя — па вазе. Золата (як і срэбра, плаціна, брыльянты) у Таргсіне прымалася ў насельніцтва па цэнах, у некалькі разоў заніжаных у параўнанні з сусветнымі. Больш за тое, атрымаўшы таварныя ордары, здатчыкі былі вымушаны купляць за іх дэфіцытныя тавары па значна завышаных цэнах. Напрыклад, прадукты ў Таргсіне падчас галадамору прадаваліся ў сярэднім у 3,3 раза, а найбольш запатрабаваныя тавары «хлебнай групы» — у 5 разоў даражэй за тыя, па якіх іх экспартавалі за мяжу.

«Залатыя» аперацыі, якія распачаліся ў канцы 1931 г., імкліва пашырыліся ў наступным годзе, калі ў СССР пачаўся масавы голад. Развал сялянскай гаспадаркі падчас калектывізацыі і другі запар неўраджайны год абяцаў Таргсіну залатыя горы. У час галадамору людзі неслі каштоўнасці ў Таргсін для абмену іх не на футры і далікатэсы, а на жытнюю муку. Яны здымалі з сябе нацельныя крыжы, завушніцы, заручальныя пярсцёнкі. У 1932 г. Белкантора нарыхтавала 580 кг золата. Акрамя таго, насельніцтва рэспублікі здала наяўнай замежнай валюты на 1 040 000, а таксама атрымала замежных грашовых пераводаў на 1 950 000 таргсінаўскіх рублёў. Такім чынам, пастаўлены Масквой гадавы план нарыхтоўкі золатавалютных каштоўнасцяў у памеры 3 млн рублёў быў нават перавыкананы.

Узняць гэтыя паказчыкі перашкаджалі абмежаваныя тэхнічныя магчымасці, з-за якіх амаль штодня каля ўвахода ў мінскі скуппункт утваралася чарга да 50 чалавек. На перыферыі асобныя памяшканні для скупкі золата ўвогуле адсутнічалі. Напрыклад, у Віцебску прыёмшчык прымаў золата ва ўласнай кватэры. З-за нізкай кваліфікацыі прыёмшчыкаў, акрамя Мінска, нідзе не прымаліся замежныя срэбныя манеты, былі праблемы з прыёмкай папяровых грошай асобных краін.

Партыйнае кіраўніцтва рэспублікі апаратыўна далучылася да выканання важнага дзяржаўнага задання. Да канца 1933 г., акрамя цэнтральнага скуппункта ў сталічным універмагу, свае паслугі галодным мінчукам ужо прапаноўвалі пункты № 1 на рагу Ленінскай і Савецкай, № 2 (Савецкая, 24), № 3 (Ленінская, 10), № 4 (Гандлёвая, 50), № 5 (Камунальная), № 6 (Савецкая, 127), № 7 (Савецкая, 59), № 8 (Вольная, 2) і № 9 (Міхайлаўская). У 1934 г. яшчэ адзін пункт адкрыўся на вуліцы Нямігскай, «...у раёне канцэнтрацыі значнай колькасці атрымальнікаў валютных пераводаў». Шэсць пунктаў працавалі ў Віцебску, чатыры — у Магілёве, тры — у Гомелі, па два — у Бабруйску і Оршы, па адным — у Полацку, Мазыры, Слуцку, Шклове, Рэчыцы, Петрыкаве, Клімавічах, Чэрвені, Калінкавічах, Лепелі, Глуску, Рагачове, Жлобіне, Чавусах, Гарадку.

### «Маці ўспомніла, што ў куфэрку ляжыць бабчына ікона Божае Маці»

На пачатку 1933 г. скупачным пунктам было дазволена прымаць у насельніцтва срэбра, у выніку чаго чэргі каля іх зрабіліся значна даўжэйшымі. Сярод іншых жыхароў БССР у тыя чэргі былі вымушаны стаць сямейнікі Якуба Коласа. Вось як пра гэта згадваў яго сын Міхась Канстанцінавіч Міцкевіч: *«Маці ўспомніла, што ў куфэрку ляжыць бабчына ікона Божае Маці. Ікона была ў важкім акладзе цёмнага металу. Даніка, як хіміка, папрасілі высветліць, ці не срэбра гэта. Ён мазнуў салянай кіслатой, і аклад заблішчэў. Занеслі ў таргсін — срэбра аказалася высокай пробы. За яго атрымалі каля пуда грэчкі, цукар, масла. Адным словам, Божая Маці моцна падтрымала сям'ю».*

Не менш важнай крыніцай валютных паступленняў у дзяржаўны бюджэт былі грашовыя пераводы грамадзянам СССР ад сваякоў і сяброў, якія пражывалі за мяжой. Валютныя пераводы, якія савецкая дзяржава і раней настойліва прапаноўвала атрымліваць у рублях па афіцыйным курсе, з 1931 г. у дырэктыўным парадку абменьваліся па заніжаным курсе на таргсінаўскія рублі. Павелічэнню колькасці валютных пераводаў паспрыяў голад, прымусіўшы звяртацца па дапамогу да замежных сваякоў дзясяткі тысяч савецкіх людзей. Больш чым палову ад усіх грашовых пераводаў траплялі ў Мінск з ЗША. Пераважна гэта былі невялікія сумы долараў, што дасылалі сваякам беларускія яўрэі, якія з'ехалі ў Амерыку ў пошуках лепшай долі яшчэ да рэвалюцыі. У 1934 г. «грошы на Таргсін» бацьку класіка беларускай літаратуры — Адаму Багдановічу пераводзіла яго сваячка Кацярына Пешкава, якая ў той час узначальвала праваабарончую арганізацыю «Дапамога палітычным зняволеным».

Пасля добрага ўраджаю 1933 года голад адступіў. Адпаведна больш чым удвая зменшыўся для БССР план нарыхтоўкі золатавалютных каштоўнасцяў на 1934 год — 2,5 млн рублёў. Гэты план быў выкананы толькі на 89 %, што ў справаздачы тлумачылася «змяншэннем золата і срэбра ў мясцовага насельніцтва», а таксама эканамічным крызісам на Захадзе, у выніку якога скараціласа колькасць пераводаў з-за мяжы. У 1934 г. жыхары рэспублікі перадалі дзяржаве валюты і рэчаў на 2 197 200 рублёў. Амаль палову ад гэтай сумы склалі валютныя пераводы з-за мяжы — 47,4 %. 30,8 % далі залатыя лом і чакан, 15,7 % — наяўная замежная валюта, 5,5 % — срэбра, 0,6 % — брыльянты.

### «Каштоўныя камяні ў насельніцтва маюцца, толькі трэба ўмець арганізаваць прыёмку»

«Нарыхтоўка» Таргсінам брыльянтаў распачалася ў канцы 1933 г. Пра важнасць, якая надавалася падобным аперацыям, сведчыць рас-

# «ТАРГСІН», Ў САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

параджэнне, згодна з якім кіраўніцтва Белканторы павінна было дакладаць пра іх у Маскву кожныя пяць дзён. Пададзеныя ніжэй вытрымкі з тых дакладаў перадаюць стан дыяментавай ліхаманкі, якая ахапіла БССР у 1934 г.: *«...У Мінскай мытні маюцца дыяменты, а таксама залатыя ўпрыгожанні з дыяментамі. Спасылаючыся на інструкцыю, мытнікі адпраўляюць гэтыя рэчы ў Маскву. Просім хадайнічаць перад Галоўным мытным упраўленнем аб перадачы рэчаў нам», «...Каштоўныя камяні ў насельніцтва краю маюцца, толькі трэба жадаць і ўмець арганізаваць прыёмку і прыцягваць здатчыкаў»* і інш.

Нягледзячы на ўсе высілкі, пасля рэкорднага 1933 г. паказчыкі 1934 г. упалі ніжэй, чым у 1932 г. Але ў адрозненні ад 1932 г., у 1934 г. яны былі дасягнуты з прыцягненнем значна большых матэрыяльна-тэхнічных і чалавечых рэсурсаў. Гандлёвая сетка Таргсіна рабілася нерэнтабельнай. Пачаліся работы па яе згортванні.

1 студзеня 1935 г. адмянілі хлебныя карткі, 1 кастрычніка 1935 г. — карткі на іншыя харчовыя тавары, 1 студзеня 1936 г. — карткі на прамысловыя тавары. Адкрыліся новыя ўзорныя ўнівермагі, у якіх за прадукты і тавары можна было плаціць у звычайных савецкіх рублях. Паляпшэнне эканамічнага становішча насельніцтва абумовіла далейшае скарачэнне золатавалютнага плана на 1935 г., які быў даведзены да Белканторы Таргсін у аб'ёме 1,5 млн рублёў. У кожным наступным квартале было запланавана паступовае змяншэнне золатавалютных паступленняў: у першым квартале — 450 тыс., у другім — 400 тыс., у трэцім — 350 тыс., у чацвёртым — 300 тыс. рублёў. У рэальнасці ўсё было з дакладнасцю наадварот. У першым квартале план быў выкананы меней, чым на 90 %, затое ў апошнім перавыканы, што тлумачылася ажыятажным попытам на тавары Таргсіна, які ўзнік пасля рашэння ўрада аб яго закрыцці.

Што можна было набыць ва ўнівермагах Таргсіна на таварныя ордары, атрыманыя за здадзенае золата і валюту? Пералік тавараў, што прапаноўваліся ў рэкламным буклеце 1935 г., уражвае нават сённяшняга, спрактыкаванага спажыўца: швейцарскі і галандскі сыры, кава мока, салямі, карэйка, языкі бычыныя, масліны, балык, ікра паюсная, арэхі, фруктовыя кансервы, шакалад, цукеркі, касметыка, футры і манто з блакітнага пясцу і собалю, англійскія кашулі і камізэлькі, дамская бялізна і шыфонавыя кашулі, джэмперы і касцюмы з імпартнай воўны, кашнэ і берэты, фільдэперсавыя панчохі і купальныя касцюмы, імпартныя ровары, швейныя машыны, патэфоны, радыёпрыёмнікі, фотаапараты, гадзіннікі.

Цытаваны вышэй буклет быў складзены ў час, калі асноўнымі карыстальнікамі ўнівермагаў Таргсіна сталі заможныя грамадзяне, якія жадалі набыць каштоўныя тавары элітнага попыту. У гады «галоднага» попыту найбольш запатрабаваным таварам з'яўлялася айчынная жытняя і пшанічная мука нізкіх гатункаў, якая складала да 40 % у агульнай масе прададзенага. Гэты аб'ём быў бы яшчэ больш, калі б не яе абмежаваныя пастаўкі на базу Таргсін, якая забяспечвалася з тых жа мізэрных дзяржаўных фондаў, што і звычайны гандаль. Адзенне, абутак, а таксама тавары хатняга ўжытку падчас голаду амаль не куплялі.

У справаздачы Белканторы адзначалася, што ў 1934 г. колькасць гарадскіх пакупнікоў у яе крамах павялічылася і склала 83,4 %, сярод якіх 26,4 % — мінчукі. З адступленнем голаду колькасць вясковых пакупнікоў, наадварот, паменшылася, што адбілася на скарачэнні аб'ёмаў рэалізацыі мукі.

### «Ён бярэ чалавека за каўнер і выкідае на вуліцу»

Нягледзячы на «залаты» кошт тавараў, культура гандлю ў крамах сеткі Таргсін фактычна адсутнічала. Хамства, якое было неад'емным атрыбутам усяго савецкага рытэйлу, у поўнай меры прысутнічала ў гандлёвых залах Таргсіна. Жорсткасць правілаў гандлю спалучалася з дрэннай якасцю паслуг і дэфіцытам тавараў. Прысланы ў маі 1932 г. для праверкі дзейнасці Белканторы маскоўскі інспектар так ахарактарызаваў сітуацыю ў мінскім цэнтральным універмагу: *«Большасць кадраў некваліфікаваныя, укамплектаваны жонкамі адказных супрацоўнікаў. ...Хенелес — няветлівы, нявытрыманы, лаецца матам пры пакупніках. ...Прадаўшчыца бакалейнага аддзела Рачкоўская грубаватая. ...Камсамолка Айзенман нетактоўная, пакупнікі яе баяцца».*



Яшчэ горш сітуацыя з абслугоўваннем пакупнікоў была ў раёнах. Інспектар, правяраўшы ў лютым 1934 г. бягомльскі ўнівермаг, быў шакаваны ўбачаным: *«Тавар амаль не выкладаецца, шмат пустых паліц, у краме холадна, няўтульна, брудна. Прадаўшчыца, касір і загадчык Гулевіч ходзяць без халатаў і галаўных убораў, у скураных куртках, нібыта чэкісты. Тавары адпускаюцца рукамі, без паперы. Вельмі грубая адносіны, у асаблівасці загадчыка, да кліентуры, ёсць такія выпадкі, калі ён бярэ чалавека за каўнер і выкідае на вуліцу. З боку наведвальнікаў назіраецца боязь заходзіць у краму».*

Эканоміка дэфіцыту дазваляла працаўнікам гандлю дэманстраваць сваю перавагу любому пакупніку, незалежна ад яго сацыяльнага становішча і прафесійнага статусу. Падобныя паводзіны непазбежна прыводзілі да шматлікіх канфліктных сітуацый, некаторыя з якіх набывалі характар міжнароднага скандалу. Напрыклад, у студзені 1935 г. упаўнаважаны Наркамата замежных спраў СССР пры СНК БССР атрымаў скаргу ад жонкі генеральнага консула Польшчы ў Мінску на дрэннае абслугоўванне ў мясной секцыі сталічнай крамы № 3.

Кіраўніцтва Белканторы прыкладала намаганні для паляпшэння якасці абслугоўвання пакупнікоў у сваіх крамах. Выступаючы на пачатку 1935 г. на нарадзе дырэктараў крам, Сакалоўскі казаў пра арганізаваную ў Мінску вучобу для прадаўцоў, выраб для іх спецадзення, фірмовых значкаў, а таксама пра дагаворы, падпісаныя з арцелямі цырульнікаў на іх стрыжку, галенне і нават манікюрныя працэдуры.

Неўзабаве пасля ўтварэння аб'яднання Таргсін кіраўніцтва краіны дазволіла выдзяляць «ліміты» таргсінаўскіх тавараў для забеспячэння прадстаўнічых патрэб мясцовых улад — правядзення з'ездаў, канферэнцый, нарад. З цягам часу не абмежаваныя ніякімі канкрэтнымі лічбамі «ліміты» зрабіліся «шчылінай», дзякуючы якой мясцовыя эліты пачалі набываць дэфіцытныя тавары за савецкія рублі для асабістага спажывання. Партыйныя, савецкія, прафсаюзныя кіраўнікі, а таксама начальства АДПУ разглядала таргсінаўскія крамы як ведамасны размеркавальнік. Гэта непазбежна стварала канфліктныя сітуацыі з кіраўніцтвам Белканторы, якая павінна была штомесяц даваць план. Адзін з падобных канфліктаў адбыўся ў 1934 г. у Бягомлі, дзе згаданы вышэй загадчык крамы Гулевіч быў арыштаваны за шматлікія парушэнні, у тым ліку продаж супрацоўнікам міліцыі бочкі селядцоў за савецкія рублі. Факты продажу супрацоўнікам АДПУ дэфіцытных тавараў за савецкія рублі адзначаліся таксама ў іншых месцах.

### «Прашу звярнуць Вашу ўвагу на пачварныя з'явы, якімі акружана крама Таргсін № 4 на Ніжнім базары»

Тавары, што захоўваліся на складах і паліцах таргсінаўскіх універмагаў, прыцягвалі шматлікіх злачынцаў. Ахова, якая, паводле слоў дырэктара рэспубліканскай базы Таргсін Гольдзіна, складалася са «...старых, узброіць якіх немагчыма», не ўяўляла для іх сур'ёзнай праблемы. Акрамя дробнага крадзяжу з прылаўкаў, найбольш дзёрзкія злачынцы рабілі падкопы, выкарыстоўвалі вентыляцыйныя шахты, атручвалі ахову. У Віцебску рабаўнікі пранiклі ва ўнівермаг на вуліцы Замкавай уначы, праз адтуліну, зробленую ў столі. Забраўшы найбольш каштоўныя тавары, а таксама касу, яны павольна сышлі праз акно і бясследна зніклі. У маі 1935 г. былі затрыманы злодзеі, якія вынеслі з бабруйскага ўнівермага тавараў на суму 190 рублёў золатам.

Асаблівую групу кліентаў Таргсіна складалі спекулянты, якія зараблялі на перапродажы таварных ордараў, што ішлі на чорным рынку з разліку 60 і нават 70 савецкіх рублёў за 1 таргсінаўскі. Яны таксама перапрадавалі набытыя ў таргсінаўскіх універмагах тавары, наладжвалі ў прылеглых да скупачных пунктаў вуліцах, скверах, пад'ездах альтэрнатыўную скупку золата і валюты. Побач са спекулянтамі дзейнічалі ашуканцы розных спецыялізацый, якія прапаноўвалі добрасумленным здатчыкам фальшывыя долары, «куклы» і г. д. Летам 1933 г. былі выкрыты факты крадзяжу валютных чэкаў на мінскай пошце.

Дзейнасць злачынцаў павінна была ўскладніць увядзенне ў лютым 1933 г. імянных таргсінаўскіх кніжак замест таварных ордараў. Але неўзабаве спекулянты і нядобрасумленныя прадаўцы вынайшлі спосабы абыходу дадзенага абмежавання. У жніўні 1934 г. кіраўнік Белканторы атрымаў ад мінчука Запольскага скаргу, з якой вынікала, што спекулянты, прынамсі ў Мінску, дзейнічаюць пры актыўнай падтрымцы гандляроў. Ён, у прыватнасці, пісаў: *«Прашу звярнуць Вашу ўвагу на пачварныя з'явы, якімі акружана крама Таргсін № 4 на Ніжнім базары. Спекуляцыя разгарнулася на ўсю моц. Гэтай спекуляцыі вельмі спрыяе касірка Міндаль. Назіраюцца такія з'явы: спекулянты скупляюць ордары ў людзей вясковых і малапісьменных, якія па няведанні адразаюць іх з уласных кніжак. Ордары без кніжак атаварваць нельга, але касірка Міндаль ахвотна бярэ іх у спекулянтаў, канешне, за добрую цану (хабар)».*

Шчыльнае ўзаемавыгаднае «супрацоўніцтва» работнікаў прылаўка з працаўнікамі чорнага рынку, гэтаксама, як і прыпіскі, завышэнне цэнаў, крадзеж, да 1933 г. набылі хранічны характар і патрабавалі экстраардынарных захадаў. У студзені 1934 г. у Маскве і рэгіянальных падраздзяленнях Таргсіна была створана ўласная асобая інспекцыя па барацьбе са злоўжываннямі і крадзяжом. У Мінску яе ўзначаліў нейкі Тамашэвіч, які адразу распачаў правядзенне планавых і раптоўных праверак гандлёвых пунктаў.

У лютым — сакавіку 1934 г. работу Белканторы правяраў начальнік Галоўнай асобай інспекцыі Бабінчук. Высновы, зробленыя маскоўскім правяраючым, былі несуцяшальныя для яго беларускіх калег. Бабінчук зафіксаваў поўную адсутнасць канкрэтнага кіраўніцтва з боку Львовіча, што, на яго думку, межавала са злачынствам. Беларуская база Таргсіна была затаварана нехадавымі таварамі, бухгалтарскі ўлік у іх пастаўлены дрэнна, у падборы кадраў буяў пратэкцыянізм. Найбольш распаўсюджаным парушэннем з'яўлялася фіктыўнае актаванне тавару, іншымі словамі, яго раскраданне як «страціўшага якасць». Па выніках праверкі Львовіча знялі з пасады, а яго справу перадалі ў следчыя органы.

Маскоўская праверка стала падмуркам для так званай «справы Таргсіна» 1934 г., паводле якой было асуджана 27 супрацоўнікаў Беларускай канторы на чале з Львовічам. Кіраўнік канторы атрымаў тры гады зняволення ўмоўна. Астатнія фігуранты справы, абвінавачаныя ў раскраданні дзяржаўнай маёмасці, падробцы таварных ордараў, гандлі за золата без кніжак атрымалі розныя тэрміны ад 1 да 10 гадоў турмы. Малодшага міліцыянера Сіроткіна за ўдзел у махінацыях з ордарамі звольнілі з органаў. Агулам удзельнікі «справы Таргсіна» нанеслі дзяржаве шкоду ў памеры больш чым тры тысячы залатых рублёў.

У тым жа годзе на розныя тэрміны зняволення была асуджанна група работнікаў слуцкага ўнівермага на чале з яго загадчыкам Гольдбергам. У студзені 1935 г. судзілі групу супрацоўнікаў віцебскай гандлёвай базы Таргсіна ў колькасці 13 чалавек. У маі таго ж года на лаву падсудных трапілі тры супрацоўнікі гомельскай гандлёвай базы. Гэтыя злачынныя групы былі выкрыты ў значнай ступені дзякуючы створанай Тамашэвічам сетцы паведамляльнікаў.

Да канца 1935 г. Таргсін зрабіўся непатрэбным. Большая частка золатавалютных каштоўнасцяў з насельніцтва была ўжо выпампавана. Скарачэнне аб'ёму імпарту суправаджалася стабільным павелічэннем золатаздабычы ў СССР. Краіна вярнулася да станоўчага сальда знешняга гандлю. З кастрычніка 1935 г. выйшла пастанова СНК БССР «Аб скарачэнні гандлёвай сеткі Таргсіна», адпаведна якой памяшканні ліквідаваных універмагаў Таргсіна ў Гомелі, Віцебску, Мінску, Клімавічах, Петрыкаве, Рагачове, Уздзе перадаваліся Белгандлю. 1 студзеня 1936 г. закрыліся ўнівермагі Таргсіна ў Барысаве, Магілёве, Мазыры, Оршы, Полацку, Чэрвені, Рэчыцы, Лепелі. 1 лютага 1936 г. — усе астатнія. У іх памяшканнях былі адкрыты звычайныя крамы. Імянныя таргсінаўскія кніжкі анулявалiся.

Дзейнасць Таргсіна мела вялікае значэнне для індустрыялізацыі. За «нарыхтаваныя» ім каштоўнасці была набыта пятая частка савецкага імпарту 1932—1935 гг. Голад з'явіўся галоўным фактарам поспеху Таргсіна. У «зорным» для яго 1933 г. насельніцтва СССР забяспечыла трэцюю частку ад агульнай валютнай выручкі краіны. Таргсін быў адным з эпізодаў залатой ліхаманкі, якую выклікала правядзенне індустрыялізацыі «з пустой кішэняй». За чатыры гады яго існавання галоднае насельніцтва Савецкай Беларусі прынесла ў агульны «кашалёк» золатавалютных каштоўнасцяў эквівалентна амаль дзевяці тонам чыстага золата.

**Аляксандр ГУЖАЛОЎСКІ.**

**Фота з кнігі Алены АСОКІНАЙ «Алхімія савецкай індустрыялізацыі. Час Таргсіна»**

З людзьмі і сам-насам

# СВЯТЛО РОДНАЙ ГАЗЕТЫ

**...Гэтую праўдзівую гісторыю расказваў нехта з работнікаў нашага Беларускага радыё. Магчыма — пра легендарнага Ільюо Кургана. А, зрэшты, не так важна прозвішча... Факт, што гэта быў прафесійны дыктар — з ведамі, з вопытам работы. Да таго ж, тэкст перад эфірам ён не раз прачытаў і перад мікрафонам памыліцца проста не мог. Але...**
**Праўду кажуць, што нават ліс, хітруга, і той у пастку трапляе. Вось і дыктар: у руках трымаў тэкст апавядання, бачыў першыя словы: «Танула кабета...», а вымавіў чамусьці: «Танула... кабыла». Тут жа зразумеў, што абмовіўся, што памыліўся! Тут жа выправіўся, сказаў у працяг: «А побач — танула кабета». І далей па тэксце, без ніводнай запінкі, ужо да канца...**

Дачытаў апавяданне — як быццам зрабіў сваю справу, а страх усё роўна застаўся, бо нехта ж мог заўважыць гэту прыкрую недакладнасць, данесці начальству, а ўжо яно... Выкліча на дыван? Аб'явіць вымову? Пазбавіць прэміі?..

Дыктар чакаў чаго заўгодна, толькі не гэтага: у рэдакцыю з усіх куткоў Беларусі паляцелі пісьмы, змест якіх зводзіўся да аднаго: добра, кабету, якая танула, выратавалі. А што ж з кабылай? Яна ці жывая?

ЦЯПЕР нават не верыцца, што былі такія часы: людзі слухалі радыё, думалі над тым, што пачулі, хваляваліся за лёс герояў (нават мастацкіх твораў)... Людзі і сапраўды пісалі — на радыё, тэлебачанне... Нямала пісем ішло і на адрас «Звязды».

З той пары вельмі шмат што змянілася. І не змянілася: ва ўсякім разе «прароцтва» аб тым, што праз 20 гадоў не будзе ні кніг, ні кіно, ні тэатра, ні газет, дзякуй богу, не спраўдзілася — нават праз 40. Людзі па-ранейшаму ходзяць у кіно і тэатры, па-ранейшаму чытаюць — у тым ліку «Звязду». І нават пішуць пра яе цікавыя лісты. А, зрэшты, мяркуйце самі.

*«Бягуць дзянькі,*
*у садзе — восень,*
*Не за гарамі і снягі...*
*Але нязменна*
*мне прыносяць*
*Газеты нумар дарагі».*

З такіх прывітальных радкоў пачынае свой ліст **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавіч**. Яна ж прызнаецца, што чым болей часу выпісвае і чытае «Звязду», тым больш яна падабаецца. І далей (даслоўна): *«Не падумайце, што мне няма з чым параўноўваць — даносіць пошта і іншыя выданні. Але ўсё нейкае не тое. «Звязда» для мне — тэлевізар я наогул не ўключаю — адзіная бадай крыніца сур'ёзнай інфармацыі. Тут падрабязнасці пэўных падзей, разважанні пра надзённае, змястоўныя гутаркі і артыкулы на розныя тэмы. Ёсць над чым падумаць, паразважаць. Прачытаўшы, заўсёды звяртаю ўвагу на прозвішчы аўтараў. Сярод іх апошнім часам з'яўляюцца незнаёмыя — магчыма, новых маладых журналістаў, якія робяць газету яшчэ больш цікавай.*

*Дзякуй, «Звязда», і так трымаць!»*

Прыкладна той жа лейтматыў і ў лісце **спадара Букоўскага з Глыбоччыны**: *«Звязда» і сапраўды родная газета на роднай мове, бо яе (са жніўня 1917-га!) чыталі яшчэ прадзеды. Чыталі, што важна, на той жа мове, што і размаўлялі. А таму і праз добрыя сто гадоў разгортваеш свежы нумар газеты і нібы чуеш пяшчотны голас маці, суцяшальны — бабулі, абнадзейлівы — сваёй першай настаўніцы... Як ні круці, а слова — роднае — заўжды з чалавекам, аж пакуль ён жыве».*

І жыць — дададзім — спадзяецца... Нягледзячы ні на што.

*«Як ні засцерагайся ад гэтага каварнага віруса, а падчапіць усё роўна можаш»,* — канстатуе **спадарыня Таццяна Новік з Клецка**. Яна ж паведамляе, што з самага пачатку пандэміі прыслухоўвалася да рэкамендацый спецыялістаў, выконвала іх, прычым правільна, але, як піша, гэта не дапамагло — захварэла. *«Шчасце яшчэ, што нашы медыкі (нізкі паклон ім!) навучыліся змагацца з невядомай, каварнай хваробай, і, калі не запусціць яе — своечасова пачаць лячэнне, ёсць шанцы паправіцца, вярнуцца да звычайнага жыцця».*

Спадарыня Таццяна, дзякаваць богу і ўрачам, гэта ўжо зрабіла: жыве дома, займаецца прывычнымі справамі, сярод якіх... *«Яшчэ лежачы ў бальніцы, я старалася па магчымасці праглядаць «Звязду», цяпер — чытаю».*

Дарагія словы! Ці не так?

БАГАТЫ на іх і ліст **спадарыні Ніны Бурко з Бярэзіншчыны**. *«Не мной заўважана, што ўсё добрае ў жыцці праходзіць хутка. Ну, сапраўды, азірнуцца не паспелі, як цёплае лета змянілася не вельмі халоднай восенню: дні кароткія, у садзе-агародзе работ няма, каранавірус абмежаваў зносіны з людзьмі... А значыць, усё болей часу цяпер на іншыя любімыя заняткі».*

У яе хаце, як прызнаецца шаноўная Ніна Мацвееўна, гэта чытанне, у тым ліку — свежай прэсы. Сям'я пастаянна выпісвае сваю раёнку і «Литературную газету», дзве рэспубліканскія, некалькі часопісаў. Ёсць што чытаць.

*«Помню, у маладосці, — чытаем у лісце, — мне пашчасціла пазнаёміцца з творчасцю таленавітай журналісткі і вельмі мудрай жанчыны Таццяны Тэс. Яе прозвішча я шукала ў кожным нумары газеты «Известия»...*

*Ці ёсць падобныя аўтары ў выданнях, якія выпісваю сёння? На шчасце, ёсць. І найперш тут трэба сказаць пра газету «Звязда», якая прыцягвае чытачоў, па-першае, роднай беларускай мовай, а па-другое, нават знешняй прыгажосцю дзякуючы здымкам Анатоля Клешчука, Яўгена Пясецкага...*

*Але ж павярхоўнае знаёмства з адным-двума нумарамі газеты, набытымі чалавекам на поштах ці ў гандлёвых шапіках, наўрад ці што дасць. Каб зразумець, што такое «Звязда», трэба пачытаць яе хоць бы месяц. І такім чынам даведацца пра яе дадаткі і пастаянныя рубрыкі. Па чацвяргах, напрыклад, чакаць «Сямейную газету» і «Чырвонку», па пятніцах — «Мясцовае самакіраванне», па суботах — «Жырандолю», па серадах — «Краіну здароўя», «Што людзі пішуць»...*

*Лісты ў «Звязду» — не толькі аб тым, што адбываецца ў гарадах і вёсках, што хвалюе... У іх свае меркаванні, распаведы пра цікавых людзей, успаміны аб перажытым. У тым ліку — вясёлыя...*



Фота Алены ДАЎЖАНОК.

*Помню, як некалі ў бібліятэцы гартала падшыўку «Звязды», як натрапіла на рубрыку «...Народ на провадзе!», як чытала і нібы дыхала свежым вясновым паветрам.*

*Менавіта «вясёлыя гісторыі чытачоў», уразіўшы гумарам, сваёй прастатой, праўдзівасцю і адшліфаваным сказам, назаўжды прывязалі мяне да газеты, «прымусілі» выпісаць, а потым і нешта ўспомніць, даслаць у рэдакцыю.*

*Прыдумвала і подпісы да конкурсных здымкаў — калі больш удалыя, калі менш... А потым здаралася ўбачыць свае радкі ў газеце, прычым у трошкі папраўленым, больш дасканалым выглядзе... Мне, як і многім іншым аўтарам-чытачам, дапамагала вядучая рубрыкі і тым самым заахвочвала да новага супрацоўніцтва, да безумоўнай падпіскі на газету...*

*У ёй, апроч згаданых рубрык, я заўсёды чытаю «Неасабістыя суб'ектыў» Алены Ляўковіч, «Нефармат» Святланы Яскевіч, артыкулы Людмілы Рублеўскай, Наталлі Талівінскай, Надзеі Нікалаевай...*

*Дарэчы, гады тры таму я, помню, трапіла ў бальніцу і ад іншых хворых пачула, што ў палаце паблізу — журналістка «Звязды». Мне пашчасціла пазнаёміцца і пагутарыць з гэтай вельмі інтэлігентнай усмешлівай жанчынай, пачуць ад яе словы падтрымкі. Уласна, іншага ад «Звязды» я і не чакала»,* — прызнаецца спадарыня Бурко.

І яшчэ некалькі цытат: *«Нягледзячы на ўзрост і дрэнная надвор'е, я сам пакіраваў на пошту, каб прадоўжыць падпіску на «Звязду»,* — піша **спадар Васіль Пяшэвіч з вёскі Юркевічы Жыткавіцкага раёна**. — *У аддзяленні сувязі прынялі мяне душэўна, усё зрабілі-афармілі. А заадно я пацікавіўся там, колькі ж нас засталося падпісчыкаў на «родную газету на роднай мове»? Аказалася, я — апошні. Раней, дакладна ведаю, выпісвалі школа, бібліятэка, сельскі Савет... Цяпер — адзін, але падпісчык з 1971 года».*

Здымаем капялюш, як той казаў! І шчыра дзякуем — за адданасць, за вернае сяброўства, якое пачынаецца... Хто ж ведае, з чаго?

*«НЕКАЛІ раней я чытала «Звязду» час ад часу,* — піша **спадарыня Наваенка з Глыбоччыны**. — *А вось пастаяннай падпісчыцай стала гады тры таму. Падабаецца газета і мовай сваёй, і зместам. Многія матэрыялы прымушаюць задумацца, асобныя — пасмяяцца, а то і пахваляваца. Мяркуючы па публікацыях, журналісты газеты па-ранейшаму выязджаюць у камандзіроўкі, размаўляюць з людзьмі, бываюць на розных мерапрыемствах — рызыкуюць сваім здароўем і, напэўна ж, хварэюць... Раней я нават не здзівілася б, калі б газета стала прыходзіць не пяць разоў на тыдзень, а калі-нікалі — чатыры, калі б пагоршыўся змест. Аж не! Нягледзячы на гэты каварны вірус, у «Звяздзе» ўсё, здаецца, на ранейшых месцах: актуальная інфармацыя, карысныя парады, любімыя рубрыкі.*

*Дарэчы, некалі я чытала кнігу «Мои университеты» пад рэдакцыяй Аляксандра Снегірова. У ёй пад адну вокладку сабраных шэсць апавяданняў пісьменнікаў і 34 — праўдзівыя гісторыі ад рэальных людзей. Я падумала: а чаму б і «Звяздзе» не выдаць вось такую народную кнігу? Яе, думаю, з радасцю раскупілі б, бо гэта сапраўды цікава.*

*Я буду марыць,* — піша Зоя Максімаўна, — *што такая кніга з'явіцца. А мары часам збываюцца».*

Што праўда, тое праўда. Спадарыня Наваенка, наколькі ведаем, рыхтуе да выдання сваю, прычым не першую, кнігу. Гісторыі са звяздоўскага «Праваду» складуць там цэлы раздзел.

І яшчэ адна добрая навіна: калі ўсё будзе добра, выйдзе ў свет і важкі том вершаў, напісаных **спадаром Іванам Астроўскім**. У пачатку двухтысячных у «Звяздзе» была рубрыка, прысвечаная народнаму фальклору. Іван Іванавіч, дасылаў туды творы і такім чынам, як прызнаецца, зрабіў... першы крок да Парнаса.

Каб адчуць, як далёка зайшоў, можна згадаць ужо, здаецца, крылатае:

*На кантрактныя ўмовы*
*Пераходзьце, мужыкі,*
*Пад кантролем будуць словы,*
*Пад замкамі языкі.*
Або:
*Чорт падбіў завесці дачу,*
*На дурную галаву,*
*Я за ёй жыцця не бачу*
*І ўжо кінуць не магу.*

У кнізе каля трохсот старонак!

Піша Іван Іванавіч на беларускай, рускай і нават англійскай мовах. Усё ў залежнасці ад сітуацый, ад тых, хто будзе чытаць ці слухаць. Прызнаецца, што вершы не «выседжвае» — кладзе на паперу тое, што прыходзіць само па сабе.

Зрэшты, творчасць гэтага безумоўна таленавітага аўтара «Звязды» — тэма асобная. Тут і зараз трэба пра іншых і аўтараў, і чытачоў. *«Больш як 46 гадоў я пастаянна выпісвала «Звязду»,* — прызнаецца **Ніна Іванаўна з Карэліччыны**. — Цяпер усё часцей вагаюся, бо газета дастаткова дарагая і рэкламы ў ёй вельмі шмат».

Што сказаць на вось гэта?

Хіба тое, што ў матэрыяльным плане «Звязда» жыве, відаць, таксама, як яе чытачы. Гэта значыць, што і нашы найшчырэйшыя жаданні — у тым ліку ніжэйшай цаны на падпіску і, адпаведна, большых тыражоў — не супадаюць, на жаль, з нашымі магчымасцямі. Адмаўляцца ад рэкламы пры такіх абставінах, згадзіцеся, неяк не разумна. Гэта па-першае, па-другое...

Многія з дарослых дзяцей дапамагаюць цяпер сваім бацькам — бяруць на сябе аплату патрэбных лекаў, дроў, камунальных паслуг — таго, што сапраўды неабходна... Дык, можа, у гэты пералік варта было б уключыць падпіску на газету? І чаму б не на роднай мове?

Ёсць і па-трэцяе — яшчэ адзін ліст. *«Звязда» і сапраўды газета дарагая,* — піша **спадарыня Вайтковіч з Мінска**, — *мае суседкі выпісваюць таннейшыя. Але ж яны і атрымліваюць іх радзей, і самі кажуць, што чытаць там няма чаго. А я ў сваёй знаходжу і нешта для душы, для розуму і роздуму, смешныя гісторыі, новыя рэцэпты, цікавыя цытаты, нават рэкламу. Дзякуючы ёй, наша сям'я некалі выбрала для сябе прадукцыю Маладзечанскага і Слуцкага хлебазаводаў, Ашмянскага і Ваўкавыскага мясакамбінатаў, «малочку» з Пастаў».*

Нехта выбраў іншае ці проста згарнуў нецікавыя старонкі — на карысць цікавых. Яны ў газеце па-ранейшаму ёсць і, напэўна ж, будуць, бо і сапраўды *«шмат зорак у «Звяздзе», кожная свеціць па-свойму»...*

**Пошту чытала**
**Валянціна ДОЎНАР.**

На слыху

# «У РЭАНІМАЦЫІ ЎСЕ ПАЦЫЕНТЫ ШКАДУЮЦЬ, ШТО НЕ ПРЫШЧАПІЛІСЯ»

**У першай частцы нашай размовы Вольга СВЯТЛІЦКАЯ, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры анестэзіялогіі і рэанімацыі БелМАПА, якая працуе ў Гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, расказала, чым небяспечны дэльта-штам каранавіруса, як пацыенты становяцца кіслародазалежнымі і ў якіх выпадках іх пераводзяць у рэанімацыю. Сёння мы размаўляем пра тое, як адбываецца выздараўленне і адлучэнне ад апарата ШВЛ, што павінны ведаць людзі, чые блізкія трапілі ў рэанімацыю, і чаму так важна пісаць ім лісты.**

## «Усе прачынаюцца па-рознаму: хтосьці за два-тры дні, іншыя — за тыдзень»

***— Вольга Іванаўна, раскажыце, як адбываецца адлучэнне ад апарата ШВЛ?***

— Крытэрыем служыць змяншэнне праяў захворвання, якое выклікала перавод на ШВЛ. У дадзеным выпадку гэта цяжкая пнеўманія і рэспіраторны дыстрэс-сіндром. Урач не будзе выводзіць з медыкаментознага сну, пакуль не зразумее, што пацыенту становіцца лягчэй. Калі мы бачым, што чалавеку патрабуюцца ўжо не такія высокія канцэнтрацыі кіслароду, параметры вентыляцыі становяцца больш мяккія і падобныя да фізіялагічнага дыхання, а працэсы ў лёгкіх пачынаюць сваю эвалюцыю, пацыент гатовы да адлучэння ад ШВЛ. Адзін з крытэрыяў — калі мы можам павярнуць яго на спіну і сатурацыя не зніжаецца пры ўмераным узроўні кіслароду. У прыватнасці, калі пры ўзроўні кіслароду менш за 60 % у пацыента ў становішчы на спіне трымаецца сатурацыя не менш за 92 %, гэта сведчыць пра тое, што рэспіраторны дыстрэс-сіндром пачынае адступаць.

У гэтай сітуацыі большасці пацыентаў часова ставіцца трахеастома: многія трубачка для дыхання ўводзіцца непасрэдна ў трахею ніжэй за галасавыя звязкі. Яе многія пацыенты нават не заўважаюць. Каб абудзіць пацыента, мы прыпыняем медыкаментозны сон. Усе прачынаюцца па-рознаму: камусьці хапае два-тры дні, камусьці трэба тыдзень і больш. У нашай рэанімацыі з пацыентамі абавязкова працуе рэабілітолаг — робіць масаж, выконвае розныя рухі, каб не было кантрактур суставаў, каб аднаўляліся мышцы.

Адлучэнне ад апарата часам займае 2/3 усяго знаходжання на ШВЛ, гэта вялікае мастацтва — такое ж, як і змадэляваць дыханне на апараце. Каб навучыцца вентыляваць пацыентаў з цяжкім дыстрэс-сіндромам, патрэбны калі не гады, то дакладна месяцы пастаяннай работы пад кіраўніцтвам старэйшых і вопытных рэаніматолагаў. Гэта складанае абсталяванне, якое пастаянна ўдасканальваецца. За 20 гадоў маёй працы ў рэанімацыйнай службе я пабачыла некалькі мадыфікацый апаратаў. Мой першы апарат і апараты, якія выкарыстоўваюцца цяпер, — гэта дзве розныя эпохі.

***— Чаму ўзнікаюць праблемы з медыцынскім кіслародам?***

— Мы сталі спажываць яго вельмі шмат з-за вялікай колькасці кіслародазалежных пацыентаў. Аб'ём пашкоджання лёгкіх стаў большы, адпаведна, нам патрабуецца больш кіслароду. У першую хвалю людзі атрымлівалі пяць літраў кіслароду ў хвіліну, і гэтага было дастаткова, каб узняць сатурацыю. У гэту хвалю сем-дзесяць літраў у хвіліну выдаткоўваецца на пацыента ў тэрапеўтычных аддзяленнях. У рэанімацыі для пацыентаў на неінвазіўнай і інвазіўнай вентыляцыі патрабуецца часта 80—90 % кіслароду і больш.

Атрымліваецца, што эканамічна выгадна, каб людзі дыхалі праз маску, а не праз насавыя катэтары, дзе паток рассейваецца паветрам, — так змяншаюцца страты. Таму ўсе тэрапіі цяпер стараюцца ўкамплектавацца маскамі для накіраванай падачы кіслароду.



Я працую ў адным з найбуйнейшых стацыянараў краіны, і ў нас дзейнічае свая кіслародная станцыя, дзе вырабляецца кісларод. Складаней у тых клініках, куды яго дастаўляюць у балонах. З вялікім напружаннем працуюць кісларodчыкі, бо ім за суткі прыходзіцца мяняць мноства балонаў. Пры вялікай колькасці цяжкіх пацыентаў аднаго балона хапае на тры-чатыры гадзіны.

Але дзякуючы зладжаным дзеянням Міністэрства аховы здароўя і прадпрыемстваў, якія падключыліся да выпрацоўкі кіслароду, нам хапае. Дзякуючы крокам па мабілізацыі кіслародавытворчасці, якія былі зроблены ў краіне, мы не адчуваем дэфіцыту кіслароду.

## «Самы просты спосаб пазбегнуць тромбаў — піць ваду»

***— Як правільна лячыць пнеўманію дома?***

— Калі пастаўлены дыягназ пнеўманія з невялікім працэнтам пашкоджання, ад 5 % да 20 %, пацыент можа лячыцца дома. Тут важна ў хатніх умовах выконваць тыя ж рэкамендацыі, што і ў клінічным стацыянары, каб не павялічыць аб'ём пашкоджання лёгкіх. Дарэчы, мы рэкамендуем, каб кожная сям'я сёння мела ўласны пульсаксіметр. Мяркуючы па тым, што вірус муцірue, гэта прылада нам яшчэ спатрэбіцца. Знаходзячыся дома, трэба некалькі разоў на дзень вымяраць сатурацыю. Калі яна 95 % і вышэйшая, гэта нармальны варыянт ходу хваробы.

Важна прытрымлівацца базавых правіл. Піць ваду з разліку не менш чым 20 мл на кілаграм вагі. Калі чалавек важыць 70 кг, ён павінен выпіваць не менш за 1,4 літра вадкасці ў суткі. Гэта пры ўмове, што тэмпература не павышана і невялікае пашкоджанне лёгкіх — да 20 %. У вадкасць уключаюцца вада, чай, кампот, морс, а вось сок і суп наш арганізм успрымае як ежу. Калі чалавек тэмпературыць, то на кожны градус павышанай тэмпературы варта дадаваць каля 400 мл вадкасці. З тэмпературай 38 градусаў пры вазе 70 кг варта выпіваць каля двух літраў вадкасці ў суткі. Калі 39 — ад 2,2 да 2,5 літра. Як вядома, COVID-19 выклікае гіперкаагуляцыю і схільнасць да тромбаўтварэння. А вада разрэджвае кроў, і гэта самы просты і танны спосаб пазбегнуць тромбаў.

Чалавек павінен ляжаць у прон-пазіцыі. Па меры магчымасці можна глядзець кіно, чытаць кнігу, але на жываце. Важна, каб падушка і валік знаходзіліся пад грудзямі, і жывот пры гэтым не сціскаў дыяфрагму, выклікаючы павышэнне ўнутрыбрушнога ціску. У такой сітуацыі хворы толькі пагаршае сваё становішча. Таму людзям, якія маюць вялікі жывот, важна класці валік не толькі пад грудзі, але і пад пахвіну, каб жывот знаходзіўся паміж падушкамі і не сціскаўся.

Дома мусяць быць гарачкапаніжальныя прэпараты — парацэтамол ці яго варыянты. Можна прымаць яго ў выглядзе парашкоў супраць грыпу. Яны ўтрымліваюць у сваім складзе вітамін С і іншыя прэпараты, якія здымаюць сімптомы прастуды. Як рэаніматолаг, я не рэкамендую трываць высокую тэмпературу. Калі яна паднялася вышэй за 38 градусаў, варта яе збіваць. Асабліва гэта датычыцца пажылой групы пацыентаў і людзей са спадарожнымі хваробамі. Трываць тэмпературу — вялікі стрэс для арганізма, гэта знясільвае.

Калі варта трывожыцца? Калі сатурацыя пачынае падаць. Калі яна знізілася да 93—94 %, варта легчы ў прон-пазіцыю. Калі яна павысілася, можна так паляжаць нейкі час. Калі сатурацыя не падымаецца ці ўпала ніжэй за 92 %, не хапае паветра, варта патэлефанаваць альбо ў паліклініку і выклікаць урача, або ў хуткую дапамогу. Сказаць, што ў вас пацверджаны дыягназ COVID-19, што цяжка дыхаць і што сатурацыя вось такая.

***— Калі сатурацыя падае, скажам, да 92 %, чалавек гэта адчувае?***

